Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЖНІЎНЯ 2017 г. СУБОТА №149 (28513)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Vivat, Францыск Скарына!**

СТАР. 4



**Вашы лісты ў рэдакцыю**

СТАР. 9



**Хто яны – беларускія немцы?**

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Эрома УРБАН, намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве:**

*«Што датычыцца нашых новых распрацовак у галіне збожжавых культур, то апошнім часам у дзяржаўны рэестр краіны ўключана 10 новых сартоў. Гэта — сарты азімай пшаніцы, трыцікале, ячменю, азімага жыта — тых валаўтваральных культур, якія сёння ствараюць аснову харчовай бяспекі Беларусі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9495 | ▼ |
| Еўра | 2,3157 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0754 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Нашчадкі Вялікага Кніжніка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абітурыенткі БДУ Ганна ШАРСТНЁВА і Анастасія АНІКІЕВІЧ, выпускніцы барысаўскай школы нумар дваццаць, каля помніка Скарыну ва ўніверсітэцкім дворыку.

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА

**Гэта проста цуд: праз пяць стагоддзяў мы ведаем не год і нават не месяц — дакладную дату выдання нашай першай друкаванай кнігі. 6 жніўня 1517 года ў Празе чэшскай сын слаўнага горада Полацка Францыск Скарына выдаў «Псалтыр» — першую кнігу на той мове, на якой гаварылі на яго Радзіме...**

**Яго кнігі, калі чытаеш пра іх, уяўляюцца гэткімі масіўнымі фаліянтамі. Насамрэч гэта просценькія невялікія кніжкі звычайнага фармату ў сціплых пераплётах. І ў гэтым яшчэ адзін учынак Скарыны, за які нашчадкі павінны яму дзякаваць. Ён друкаваў кнігі не для багацеяў — для ўсяго «люду паспалітага», як бы сёння сказалі: у бюджэтным варыянце, каб іх маглі набыць і мяшчане, і рамеснікі, і сяляне, каб чыталі самі, каб вучылі чытаць сваіх дзетак. І прадмовы ён да іх пісаў абсалютна жыццёвыя, аб простых рэчах: аб справядлівасці, аб адданасці роднай зямлі. Можа, менавіта дзякуючы гэтай Скарынавай навуцы мы ў наступныя стагоддзі праз прыгнёт і заняпад вынеслі і пачуццё ўласнай годнасці, і родную мову, і цягу да асветы?**

**500 гадоў — дата прыгожая і рэдкая. Нам пашанцавала жыць якраз у гэты час і на гэтай зямлі. Адпаведна, і адзначыць яе трэба годна. Як? Проста ўзяць з паліцы (ці адкрыць на планшэце) добрую кнігу і пачытаць. Трэба думаць, Скарыну такое ўшанаванне яго жыцця і спраў прыйшлося б вельмі даспадобы.**

■ Дзяржава і бізнес

## Прадпрымальнікі дайшлі да... лібералізацыі?

**У дзелавых людзей краіны — дзве добрыя падзеі. Адна ўжо здарылася: Мінскаму сталічнаму саюзу прадпрымальнікаў і работадаўцаў 1 жніўня споўнілася 20 гадоў. Столькі ж часу беларускія бізнесмены спрабуюць знайсці агульную мову з уладай. І, як відаць, яны гэта робяць паспяхова. Якраз тут размова заходзіць пра другую падзею, якая чакаецца. Гаворка ідзе пра тое, што неўзабаве будзе падпісаны пакет дакументаў па лібералізацыі бізнесу. А гэта прамое пацвярджэнне таму, што дзелавая ініцыятыва краіне патрэбна.**

### ЧАС ДЛЯ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ?

У Еўропе малыя і сярэднія прадпрыемствы ствараюць каля 50% ВУП. У Беларусі гэтая лічба амаль удвая меншая, але пры гэтым на бізнес ускладаюцца вялікія надзеі і яго вызначаюць асноўным драйверам росту нашай эканомікі. Дык чаго ж чакаць ад новага дакумента? Прарыву? Рэвалюцыі?



На прэс-канферэнцыі 1 жніўня **старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзімір КАРАГІН** расказаў пра дасягненні за два дзясяткі гадоў дзейнасці грамадскага аб'яднання: «Зараз у аб'яднанне ўваходзяць заснавальнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў малога, сярэдняга і буйнога прыватнага прадпрымальніцтва. Члены саюза — людзі з праверанай дзелавой рэпутацыяй, якія маюць доўгатэрміновыя інтарэсы ў бізнесе. У арганізацыю ўваходзяць больш за 800 удзельнікаў і партнёрскіх прадпрыемстваў. На працягу 20 гадоў арганізацыя прымала ўдзел у стварэнні спрыяльнага дзелавога асяроддзя, у якім прадпрыемствы і прадпрымальнікі ў розных формах могуць развіваць і ўмацоўваць свой бізнес. Саюз удзельнічае ў экспертызе праектаў нарматыўных дакументаў».

СТАР. 2

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 4 дні

**На ўсе 100!!!**

**100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна. Заставайцеся з намі – будзе цікава! Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.**

# Прадпрымальнікі дайшлі да... лібералізацыі?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Важнай падзеяй для ўсяго бізнесу краіны з'яўляецца тое, што саюз прасунуў у 2005 годзе ініцыятыву аб распрацоўцы і стварэнні зборніка прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе развіццё прадпрымальніцтва, — «Нацыянальную платформу бізнесу Беларусі». «Гэтую ініцыятыву падтрымалі вядучыя рэгіянальныя бізнес-асацыяцыі краіны. Да першага жніўня 2017 года на заканадаўчым узроўні выканана больш за 420 прапаноў з «Нацыянальнай платформы бізнесу Беларусі», — паведаміў кіраўнік аб'яднання.

Але самым значным дасягненнем саюза з'яўляецца ўдзел у распрацоўцы пакета дакументаў па лібералізацыі бізнесу краіны. Рашэнне аб разняволенні прадпрымальніцкай ініцыятывы будзе прымацца ў Беларусі на ўзроўні кіраўніка дзяржавы ў найбліжэйшыя дні. «У гэтым пакеце дакументаў, які распрацоўваецца сумесна з экспертамі бізнес-асацыяцый Беларусі, адлюстроўваюцца ідэі, якія даваліся фактычна дзесяць гадоў запар на нацыянальных платформах бізнесу. Гаворка ідзе аб спрашчэнні рознага роду адміністрацыйных працэдур і аб карэнным паляпшэнні дзелавога клімату ў краіне», — растлумачыў Уладзімір Карагін.



Паводле слоў **першага віцэ-старшыні Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў, члена Савета па развіцці прадпрымальніцтва Віктара МАРГЕЛАВА**, гэта беспрэцэдэнтна прарыўны пакет дакументаў для беларускага бізнесу: «Ён вырашае мноства праблем. Там прадугледжаны прынцыпы, па якіх дзяржава будзе ўзаемадзейнічаць з бізнесам больш цесна і на больш справядлівых і перспектыўных прынцыпах. Ёсць пункты па паляпшэнні ўмоў гаспадарання па санітарных, супрацьпажарных правілах у такіх галінах, як гандаль, вытворчасць, рэклама, будаўніцтва. Ёсць шэраг нормаў, якія з'яўляюцца ключавымі для паляпшэння стану дзелавога асяроддзя. З'яўляецца пасада ўпаўнаважанага па справах прадпрымальнікаў у краіне. Разглядаецца таксама змяненне ў кантрольна-наглядной дзейнасці. На іншы ўзровень пераводзяцца праверкі. Гаворка ідзе пра сапраўды папераджальны характар іх працы. Таксама колькасць праверак павінна скараціцца. Спадзяёмся, што і колькасць штрафаў у выніку будзе паніжаная».

На думку віцэ-старшыні, дадзены пакет дакументаў ужо дастаткова глыбока прапрацаваны. Разам з тым на ўсе пытанні прадпрымальнікаў, якія яны адрасуюць дзяржаве, такім чынам урад краіны не адкажа. Новыя дакументы задаюць патрэбны вектар для эфектыўнага развіцця дзелавога асяроддзя. «Наперадзе яшчэ шмат рэальнай працы для паляпшэння дзелавога клімату. Жыццё мяняецца хутчэй, чым мы паспяваем знаходзіць рашэнні. Для гэта мы і працуем», — рэзюмаваў Віктар Маргелаў.

## ПВТ ПРЫ КОЖНАЙ МАШЫНАБУДАЎНІЧАЙ КАМПАНІІ

Дзяржаўныя чыноўнікі і самі гэта разумеюць. Таму яны не спыняюць работу па фарміраванні ўмоў для стымулявання бізнес-ініцыятывы. Ствараюцца новыя працоўныя групы, якія будуць дэталёва разглядаць пытанні дзелавой ініцыятывы. Так, напрыклад, пры Адміністрацыі Прэзідэнта створана група экспертаў у галіне права. У склад групы ўключаны аўтарытэтныя навукоўцы і высокакваліфікаваныя практыкі.



Адзін з яе ўдзельнікаў **дэкан эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ** тлумачыць, што задача вучоных і практыкаў-юрыстаў — абагульніць усе спрэчныя моманты і выказаць сваё меркаванне па канчатковай версіі любога нарматыўнага акта. Гаворачы аб развіцці беларускага бізнесу, ён адзначыў, што ў краіне стварыліся пазітыўныя ўмовы для дзелавой ініцыятывы. «Пацвярджэнне таму — досыць высокае месца нашай краіны ў рэйтынгу Сусветнага банка Doing Business — 2017 — 37-е са 190 краін свету. Іншая рэч, што малы бізнес актыўна і дынамічна развіваецца ў краіне, якая знаходзіцца на стадыі эканамічнага росту і ў якой актыўна працуюць буйныя транснацыянальныя кампаніі. Галоўны рухавік эканомікі краіны не малы бізнес, а буйныя карпарацыі», — лічыць Міхаіл Кавалёў. Ён таксама выказаў меркаванне, што буйныя дзяржаўныя кампаніі нашай краіны баяцца цесна супрацоўнічаць з малым бізнесам з-за магчымасці стаць аб'ектам праверак дзяржкантролю.

«Інавацыйны малы бізнес у ЗША меавіта так і развіваецца — яны атрымліваюць кантракты ад найбуйнейшых кампаній дзяржавы. Мы сёння ўсё чакаем дакументаў аб лібералізацыі бізнесу, але я хацеў бы ўсё ж больш увагі ўдзяліць малому інавацыйнаму бізнесу. На жаль, большая частка малых прадпрыемстваў краіны — гэта тыя, што працуюць у сферы аптовага або рознічнага гандлю. Яны патрэбныя. Але будучыня краіны і эканамічны рост залежаць не ад іх. Нам неабходна абапірацца на малы інавацыйны бізнес. У нас ужо існуе парк высокіх тэхналогій. Аднак трэба, каб свае паркі высокіх тэхналогій былі створаны пры кожнай буйной беларускай кампаніі, напрыклад пры МТЗ, Амкадоры, МАЗе, БелАЗе», — пракаментаваў сітуацыю прафесар.

Ён выказаў меркаванне, што ў такіх кампаніях патрэбныя інкубатары малога інавацыйнага бізнесу, каб у іх арбіце ствараліся новыя ідэі. Эксперт таксама лічыць, што трэба істотна прасунуць пытанне з іх фінансаваннем. «Трэба больш актыўна ствараць венчурныя фонды. Яны існуюць у форме беларускага інавацыйнага фонду, Банка развіцця, які крэдытуе стартапы. Але ўсё гэта толькі на пачатковай стадыі і не мае масавага характару, як гэта адбываецца, скажам, у Кітаі. Там за мінулы год венчурныя фонды інвеставалі ў стартапы 31 млрд долараў. Калі мы ў год пачнём укладваць у стартапы хоць бы паўмільярда долараў, тады мы можам сказаць, што Беларусь будуе эканоміку ведаў», — падкрэсліў Міхаіл Кавалёў.

Як эксперт у групе ў галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта, прафесар плануе прасоўваць ідэю падтрымкі ў першую чаргу навукаёмістага і інавацыйнага бізнесу. Ідэю стварэння дзясяткаў паркаў тэхналогій у розных галінах прамысловасці, каб Беларусь праз некалькі гадоў падключылася да працэсу Industrial revolution 4.0, які ідзе ва ўсім свеце. А гэта ўсяго толькі адзін з тых напрамкаў, якія трэба будзе ахапіць удзельнікам групы. Як бы там ні было, наперадзе работы яшчэ сапраўды шмат. Спыняцца і падводзіць вынікі яшчэ вельмі рана.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

# НЯМА НЯЗНАЧНЫХ ДРОБЯЗЯЎ

## Калі надышоў час жніва

**У паўночным рэгіёне краіны сёлета плануецца сабраць ураджай збожжавых — мінімум 1,1 мільёна тон. Яшчэ вясной надвор'е ўнесла свае карэктывы ў кампанію «Жніво-2017»: пазней правялі пасяўную, адпаведна, са спазненнем — дзён на 10 — саспеў ураджай, і пачалася ўборка.**

На рэспубліканскай селектарнай нарадзе Прэзідэнт, звяртаючыся да губернатараў, адзначыў, што не трэба рабіць «крайнім» надвор'е. Патрабаваў правесці жніво максімум да 20 жніўня. У дзень нарады на Віцебшчыне яно пачалося прыкладна ў палове рэгіёнаў. Для параўнання, летась на гэту дату прыкладна на 20% палёў праца была завершана. Затое сёлета сярэдняя ўраджайнасць вышэйшая: да 36 цэнтнераў з гектара.

Паводле слоў **старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая ШАРСТНЁВА**, нядрэнныя збожжавыя выраслі на ўсходзе. У якасці прыкладаў ён прывёў Аршанскі, Талачынскі, Дубровенскі раёны. Дарэчы, у апошнім сёлета пройдуць абласныя «Дажынкі». А вось на захадзе вобласці не такая аптымістычная карціна. Там шмат плошчаў пацярпелі ад дажджоў, неўраджайныя палі яравых... На селектарнай нарадзе віцебскі губернатар расказаў пра неабходнасць атрымання ў растэрміноўку паліва для пасяўной і ўзворвання. Як падлічылі спецыялісты, толькі ў жніўні неабходнасць у паліве для ўборкі ўраджаю і пасеву азімых — 21,7 тысячы тон.

Прэзідэнт адзначыў, што ў вобласці павінен быць тыднёвы запас паліва. Даў заданне не дапусціць страт на жніве, максімальна эфектыўна выкарыстоўваць зернесушыльнае абсталяванне. Акрамя іншага, нельга забываць пра нарыхтоўку кармоў.

Гатоўнасць уборачнай тэхнікі на Віцебшчыне склала толькі 85%. Супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю выявілі 250 камбайнаў не на хаду. У тым ліку і ў гаспадарках-перадавіках. У Сенненскім раёне спасылаліся на дэфіцыт рабочых рук, бо прыйшлося адначасова займацца нарыхтоўкай кармоў у аптымальныя тэрміны і падрыхтоўкай камбайнаў.

У пракуратуры Віцебскай вобласці падкрэсліваюць, што ўважлівы кантроль за аграпрамысловым комплексам вядзецца яшчэ з канца мінулага года. На імя губернатара адпраўляліся інфармацыйныя запіскі з вынікамі праверак.

Як адзначыла **Вольга ГРЫЦКЕВІЧ, старшы пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў пракуратуры Віцебскай вобласці**, правяраліся ўмовы захоўвання тэхнікі, гатоўнасць яе да палявых работ. Якім чынам кіраўнікі гаспадарак рэагуюць на выяўленыя недахопы? Выправіць іх аказаліся здольнымі не ўсе.

Пракуроры на месцах сочаць і за тым, як аграрыі прытрымліваюцца тэхнічных рэгламентаў, як вядзецца ахова працы. Штогод парушэнні тыповыя. Яшчэ напярэдадні пасяўной было падрыхтавана каля 100 актаў пракурорскага нагляду. І больш за 40 чалавек прыцягнута да адказнасці.

У дзень селектарнай нарады разам з журналістамі праваахоўнікі наведалі гаспадаркі Сенненскага раёна, дзе раней выявілі парушэнні ў падрыхтоўцы камбайнаў да ўборачнай. У прыватнасці, не было дазволу на тэхнічную эксплуатацыю. Амаль усе недахопы былі ліквідаваныя.

У пракуратуры вобласці адзначаюць, што таксама зацікаўлены ў канчатковым выніку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*




## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп абвінаваціў Кангрэс ЗША ў пагаршэнні адносін з Расіяй

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пасля падпісання закона аб новых антырасійскіх санкцыях абвінаваціў Кангрэс у пагаршэнні расійска-амерыканскіх адносін.

«Нашы адносіны з Расіяй знаходзяцца на небывала нізкім узроўні, небяспечна нізкім узроўні. Можа дзякаваць Кангрэсу, тым жа людзям, якія нават не могуць даць нам медстрахаванне», — напісаў ён на сваёй старонцы ў Twitter.

Нагадаем, што 2 жніўня прэзідэнт Дональд Трамп падпісаў закон аб узмацненні санкцый супраць Расіі, Ірана і КНДР. Пры гэтым сам Трамп назваў дакумент недасканалым, а шэраг уключаных у яго артыкулаў — неканстытуцыйнымі. У Крамлі лічаць, што прыняты дакумент нічога не зменіць. Прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў сказаў, што пасля падпісання закона надзеі на паляпшэнне адносін з адміністрацыяй Трампа прыйшоў канец, а Расіі абвешчана гандлёвая вайна. А вось у ЕС паабяцалі адказаць на закон аб санкцыях у найбліжэйшыя дні, бо інтарэсы некаторых краін не былі ўлічаны падчас распрацоўкі дакумента супраць расійскіх нафтагазавых кампаній.

### Мільёны атрутных яек выявілі ў крамах Германіі, Бельгіі і Нідэрландаў

У магазіны Германіі, Бельгіі і Нідэрландаў трапіла некалькі мільёнаў яек, якія змяшчаюць небяспечны хімікат — фіпраніл, паведамляюць інфармагенцтвы.

Як стала вядома, яйкі былі завезены з галандскіх ферм. У сувязі з інцыдэнтам у Нідэрландах ужо закрыта 180 птушкафабрык. Фіпраніл выкарыстоўваюць для пазбаўлення курэй ад блох, вошай і кляшчоў. З дапамогай прэпарата забаронена лячыць жывёл і птушак, мяса якіх прызначана для ўжывання ў ежу, паколькі фіпраніл небяспечны для чалавека. Па дадзеных СААЗ, ён здольны пашкодзіць печань, ныркі і шчытападобную залозу.

Мінсельгасхарч Беларусі: яйкі з Еўропы ў Беларусь не імпартуюцца. «Беларусь наогул не імпартуе яйкі, краіна закрывае свае патрэбы самастойна. Больш за тое, каля 60% выробленых у Беларусі яек мы пастаўляем на экспарт», — растлумачылі ў ведамстве.

### Прыцэльна расстралялі чужыя мішэні



Кур'ёз адбыўся на міжнародных ваенных вучэннях «АрМІ-2017», якія праходзяць у Казахстане: артылерысты з Зімбабвэ на армейскіх гульнях без промаху расстралялі... чужыя мішэні, паведамляюць казахстанскія СМІ.

Да таго ж калектыў з Зімбабвэ аказаўся адзіным разлікам, якому ўдалося паказаць стапрацэнтны вынік пры стральбе з мінамётаў, паведаміў галоўны суддзя спаборніцтваў артылерыстаў генерал-маёр Лут Альчэнекаў. Цяпер у конкурсе «Майстры артылерыйскага агню» лідзіруе зборная Казахстана, на другім месцы — ваенныя з Беларусі, замыкае тройку лідараў каманда з Кыргызстана.

На тэрыторыі Казахстана праходзяць тры конкурсы «АрМІ-2017»: «Майстры артылерыйскага агню», «Снайперскі рубеж» і «Спаборніцтва разлікаў БПЛА».

## Якасная прэса з глыбокай аналітыкай

**Беларусь сістэмна працуе над умацаваннем нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі**

**Аб гэтым заявіла ўчора міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ на рэгіянальным семінары-практыкуме «Інфармацыйнае забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці і задачы сродкаў масавай інфармацыі», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Сёння сродкі масавай інфармацыі працуюць ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, — адзначыла Лілія Ананіч. — Беларусь адкрыта дэманструе сваю інфармпрастору і пры гэтым сістэмна працуе над умацаваннем нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі».

На думку Ліліі Ананіч, рэгіянальныя СМІ — гэта пласт прэсы для кожнага чалавека. Менавіта ў рэгіёнах, ідучы па вуліцы, журналіст можа сустрэць свайго героя, а герой — зайсці ў рэдакцыю і распытаць пра змест газетных старонак.

Газеты павінны быць канкурэнтаздольныя, упэўнена міністр інфармацыі. Неабходна практычная работа кожнай рэдакцыі па сувязі са сваімі чытачамі. Інфармацыйнае поле сёння сур'ёзна змянілася. Змянілася і якасць журналістыкі.

Лілія Ананіч акцэнтавала ўвагу на тэме, якая цяпер вельмі актуальная для СМІ, — уборачнай кампаніі. Вялікія фота на першай паласе прыгожанькіх палёў упрыгожаць газету, яна будзе «дыхаць цяплом». Такую газету захочацца пераглядзець не адзін раз. «Менавіта такія выданні і праекты вяртаюцца да чытача. У іх не абязлічаная журналістыка, а якасная, з глыбокай аналітыкай», — падкрэсліла яна.

## ■ Жыллёвае пытанне

# АДРАСНАЯ ПАДТРЫМКА ЧАРГАВІКОЎ ЗАПРАЦУЕ З 7 ЖНІЎНЯ

**Размова ідзе пра пачатак дзеяння Указа №240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў», які ўводзіць адраснае субсідзіраванне ў будаўніцтве жылля. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

Дакументам у дадатак да дзеючай сістэмы льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва ўводзіцца новы від дзяржаўнай падтрымкі грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — дзяржаўныя адрасныя субсідыі. Яны будуць давацца на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам на будаўніцтва жылля, атрыманых грамадзянамі ў любым камерцыйным банку, а шматдзетным і маладым сем'ям і дзецям-сіротам — таксама на пагашэнне часткі асноўнага доўгу па такіх крэдытах. Субсідыі на пагашэнне працэнтаў і асноўнага доўгу па камерцыйным крэдыце даюцца катэгорыям грамадзян, якія ўстаноўлены Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2012 г. №13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў» з улікам падпунктаў 1.8. і 1.10. Указа №240.

Дзяржава, дзякуючы такой сістэме, прыцягвае не толькі прамыя бюджэтныя рэсурсы на падтрымку жыллёвага будаўніцтва, але і рэсурсы банкаўскай сістэмы. Механізм Указа №240 дазволіць пашырыць аб'ём крэдытавання жыллёвага будаўніцтва, і пры гэтым яно будзе ажыццяўляцца з элементамі дзяржаўнай падтрымкі. Новы дакумент дазваляе разам з тым паменшыць выдаткі бюджэту — з яго будуць кампенсаваць толькі працэнты грамадзянам. Кампенсацыя будзе адрасная і для кожнага асобнага грамадзяніна, які будзе мець на гэта права.

Плануецца, што для сям'і з трох чалавек пры ўмове, што стандартна іх забяспечваюць 60 кв. м пры кошце 660 рублёў за кв. м, пад крэдыт 35 тысяч рублёў выплата па Указе №240 — 347 рублёў, для сям'і з 4 чалавек — 463 рублі. Для шматдзетных сем'яў, якія маюць траіх дзяцей, — 80 рублёў. Для сем'яў, у якіх выхоўваюцца чацвёра дзяцей і больш, захоўваецца поўнае пагашэнне асноўнага доўгу і працэнтаў па крэдыце.

Пад Указ ацэначна вызначана 135 мільёнаў рублёў — 65 мільёнаў рублёў Беларусбанка і 70 мільёнаў рублёў Белаграпрамбанка. У далейшым у долю ўвойдуць і шэраг іншых фінансавых устаноў. Аляксандр Горваль адзначыў, што пакуль спіса новых фінансавых устаноў не з'явілася.

Атрымаць дзяржпадтрымку можна адзін раз. Але для шматдзетных сем'яў вызначана, што калі паўстала неабходнасць у паляпшэнні жыллёвых умоў у сувязі з нараджэннем яшчэ аднаго дзіцяці, то дзяржаўная падтрымка можа быць выдзелена паўторна. Гэта значыць, сям'я зноў становіцца на ўлік, прызнаецца незабяспечанай па нарматывах жылой плошчай.

Каб маладая і шматдзетная сям'я магла прэтэндаваць на дапамогу па Указе №240, ёй варта ведаць, што выдзяленне субсідыі будзе ажыццяўляцца па чарзе па аналогіі з Указам №13 (у другім выпадку — на выдачу льготных крэдытаў, у першым выпадку — на выдачу субсідый). Выканкам будзе глядзець чарговасць і пры наяўнасці кватэр, дамоў запрашаць грамадзян і прапаноўваць будаўніцтва. Гэта значыць, трэба мець неабходнасць у паляпшэнні жыллёвых умоў. Далей — пытанне малазабяспечанасці. Па Указе №13 толькі малазабяспечаным аказваецца падтрымка, у гэтым жа прававым полі працуе і Указ №240. Указ №585 улічвае толькі чарговасць.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

## ■ Юбілей

# «Ён сказаў: «Вельмі харошыя ілюстрацыі»

### СЯБРЫ І КАЛЕГІ ЯНКІ БРЫЛЯ ЎСПАМІНАМІ АДЗНАЧЫЛІ СТАГОДДЗЕ ПІСЬМЕННІКА

**Стагоддзе народнага пісьменніка Янкі Брыля адзначылі адмысловай вечарынай у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», дзе сабраліся сябры, калегі, даследчыкі і аматары яго творчасці, а таксама дочкі Наталля, Галіна і сын Андрэй. У атачэнні эксклюзіўных дакументаў з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, прадстаўленых на выстаўцы, агучваліся ўспаміны і водгукі, прысвячаліся вершы, выказвалася падзяка пісьменніку як творцу і як чалавеку.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Дзеці Янкі Брыля: дочкі Галіна, Наталля і сын Андрэй.

Стагоддзе з дня нараджэння Янкі Брыля, які пайшоў з жыцця ў 2006 годзе, адзначалі 4 жніўня. На шчасце, умовы дазволілі да гэтай даты сур'ёзна падрыхтавацца: ёсць шмат людзей, якія камунікавалі з пісьменнікам асабіста, да таго ж Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва захоўвае даволі важкі асобны фонд пісьменніка, які налічвае каля 12 750 дакументаў — рукапісаў апавяданняў, перапісак, дзённікаў (аўтар вёў іх з 1932 года і да канца жыцця), фотаздымкаў і публікацый пра пісьменніка ў СМІ. Брыль сам перадаў сваю спадчыну архіву-музею, з якім пачаў супрацоўнічаць у 1963 годзе, яшчэ калі гэта быў Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва БССР. Выстаўка, прымеркаваная да юбілею, застанецца ў галерэі да 7 жніўня, а пасля пераедзе ў архіў-музей літаратуры і мастацтва.

На вечарыне дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Акадэміі навук Іван Саверчанка расказаў пра збор твораў Янкі Брыля, над падрыхтоўкай якога цяпер працуе цэлая каманда: «Гэты збор пакажа, наколькі манументальная і шматзначная постаць Янкі Брыля ў славянскай літаратуры». Першы том збору павінен выйсці на працягу года, і, спасылаючыся на традыцыю, Іван Саверчанка прапанаваў стварыць таксама кнігу ўспамінаў пра пісьменніка, пакуль магчыма знайсці шмат людзей, якія добра яго ведалі.

«Янку Брылю была ўласціва як ні ў кога пільная ўвага да чалавека, да суразмоўніка, да таго, хто быў побач, — успамінае **літаратар, дзяржаўны і грамадскі дзеяч Анатоль БУТЭВІЧ**. — Фактычна гэта ён, заўважыўшы мае пераклады, прапанаваў мне стаць членам Саюза пісьменнікаў, а Брыль з'яўляўся адным з трох, хто павінен быў даць рэкамендацыю. Для мяне гэта, з аднаго боку, было найвышэйшай ацэнкай, а з другога боку, — авансам, які трэба адпрацоўваць. У сваіх ацэнках Янка Брыль быў справядлівы, але ашчадны: не заўсёды ён мог агучыць тое крытычнае, што было ў яго ў душы. Мне помніцца, на пытанне пра яго меркаванне аб адной кнізе ён сказаў: «Вельмі харошыя ілюстрацыі».

Вечарына да стагоддзя народнага пісьменніка Янкі Брыля была арганізавана рэдакцыяй газеты «Літаратура і мастацтва», Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і мастацкай галерэяй «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

**Соф'я КІСЯЛЁВА** ■

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ, АМАТАРЫ ВОСТРЫХ АДЧУВАННЯЎ!

**Старажытны Мсціслаў гасцінна запрашае на дзясятае па ліку сярэднявяковае свята «Рыцарскі фэст».**

З пятніцы і да самага вечара нядзелі даецца магчымасць перанесціся на некалькі стагоддзяў таму і на сабе адчуць, чым жылі нашы продкі. Аматары вострых адчуванняў будуць задаволены рыцарскімі паядынкамі, гульнямі і сярэдневяковымі атракцыёнамі. Ёсць магчымасць самому пастраляць з лука і арбалета, прымераць на сябе даспехі.

У праграме выступленне музыкантаў, майстар-класы па сярэднявечных танцах, спектаклі, монстаршоу, вогненныя і неонавыя шоу і шмат чаго іншага. Старажытны горад запрашае на шматлікія выставы і экскурсіі, дае магчымасць пакаштаваць шэдэўры кулінарыі, зрабіць стаўкі на парасячых скачках. Госці знаёмяцца з апошнім ва Усходняй Еўропе помнікам «віленскага» барока — кармеліцкім касцёлам Успення Божай Маці, захапляюцца яго ўнікальнымі фрэскамі і падымаюцца на вежу касцёла, з якой замкавая гара з яе пабудовамі, рыцарскім палаточным горадам, рамесніцкімі радамі як на далоні. Тыя, хто жадае адчуць усе перавагі жыцця самай рамантычнай эпохі чалавецтва, прыязджаюць са сваёй палаткай. Арганізатары стварылі зручныя ўмовы для паходнага пражывання. Больш падрабязную праграму свята глядзіце на сайце Мсціслаўскага райвыканкама. А лепей прыязджайце!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### 25 ГАДОЎ НА АБАРОНЕ ЭКАНАМІЧНЫХ ІНТАРЭСАЎ

**Вось ужо чвэрць стагоддзя органы фінансавых расследаванняў краіны паспяхова супрацьстаяць ілжэпрадпрымальніцтву, адмыванню грошай, ухіленню ад выплаты падаткаў, фінансавым злачынствам і карупцыі. Дзякуючы прафесійным дзеянням работнікаў упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці толькі за першае паўгоддзе было раскрыта 89 эканамічных злачынстваў на агульную суму каля 3 мільёнаў беларускіх рублёў.**

На ўрачыстым вечары, прысвечаным юбілейнай даце, начальнік упраўлення Ігар Віктаравіч Аўраменка шчыра павіншаваў супрацоўнікаў, адзначыўшы іх прафесіяналізм і адданасць справе. Асобую падзяку ён выказаў ветэранам службы, якія заўсёды былі прыкладам для маладога пакалення. Шэраг супрацоўнікаў адзначаны ганаровымі граматамі і ўзнагародамі, некаторыя атрымалі чарговыя званні. Павіншавалі калег прыйшлі кіраўнікі сілавых, праваахоўных і падатковых органаў — усе тыя, з кім у цеснай сувязі працуе фінансавая міліцыя. **Газета «Звязда» таксама зрабіла свой унёсак у асвятленне дзейнасці гэтай службы. Прыемна, што спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» па Магілёўскай вобласці Нэлі ЗІГУЛЯ была адзначана падзякай упраўлення ДФР КДК па Магілёўскай вобласці за эфектыўнае ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва.**

**Ул. інф.**

### АДЛАВІЛІ ЗМЯЮ... З ГАЗАВАЙ ПЛІТЫ Ў КВАТЭРЫ

**Мінскім ратавальнікам паступіла паведамленне ад усхваляванай гаспадыні кватэры на трэцім паверсе па вуліцы Ландэра: у газавай пліце знаходзіцца... змяя.**



Фота МНС.

Гаспадыня з дачкой хацелі паснедаць, але, калі падышлі да пліты, пачулі дзіўнае шыпенне і нават убачылі хвост, пасля чаго неадкладна звярнуліся па дапамогу па нумары «101».

Работнікі МНС, якія прыбылі на месца, агледзелі пліту і выявілі змяю ў адной з канфорак. Пры дапамозе адмысловай прылады паўзуна вынялі з кухоннай пліты. Адлоўленая змяя аказалася гадзюкай. Ратавальнікі яе абясшкодзілі. Ніхто не пацярпеў.

### ЗАСЫПАЛА ДВУХ, АДЗІН ЗАГІНУЎ...

**У Горацкім раёне ў выніку абвалу грунту засыпала двух мужчын: адзін загінуў, другога выратавалі работнікі МНС.**

Ратавальнікам Горацкага раённага аддзела МНС ад відавочцы паступіла паведамленне пра тое, што па вуліцы Міра чалавека прысыпала зямлёй.

Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, было ўстаноўлена, што пры пракладцы каналізацыйнай траншэі адбыўся зрух грунту. У выніку гэтага аказаліся засыпанымі зямлёй па грудзі два чалавекі. Да моманту прыбыцця ратавальнікаў іх спрабавалі выратаваць відавочцы. Работнікамі МНС пры дапамозе адмысловай прылады з траншэі былі вынятыя мужчыны 1975 і 1957 гадоў нараджэння. З траўмамі рознай ступені цяжкасці іх перадалі работнікам хуткай дапамогі. Праз нейкі час медыкі канстатавалі смерць старэйшага з пацярпелых.

Абставіны здарэння ўстанаўліваюцца работнікамі Горацкага раённага аддзела следчага камітэта.

### «ЛІШНІЯ» ГРОШЫ ЛЕПШ ВЯРНУЦЬ

**Мужчына, якому касір памылкова выдаў лішнія грошы, сам патэлефанаваў у міліцыю з Расіі.**

На сайце ГУУС Мінгарвыканкама была размешчана інфармацыя аб тым, што касір памылкова пры правядзенні валютна-абменнай аперацыі выдаў грамадзяніну лішнія 900 беларускіх рублёў. Гэтае здарэнне шырока асвятлялася ў СМІ, і ўжо праз некалькі гадзін супрацоўніку міліцыі, які праводзіў праверку па гэтым факце, на мабільны тэлефон паступіў званок ад мужчыны, які пазнаў сябе на фотаздымках, размешчаных на адным з сайтаў навін.

— Мужчына растлумачыў, што пасля абмену грошай з'ехаў у камандзіроўку ў Расію, дзе і знаходзіцца ў цяперашні час. Пасля вяртання дадому ён мае намер прыбыць у міліцыю, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ**. — Акрамя таго, паступілі званкі ад небайкавых грамадзян, якія таксама пазналі мужчыну на фота.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# СПЕЦВЫПУСК

# VIVAT, КНІГА! VIVAT, СКАРЫНА!

## 500 гадоў таму распачалася гісторыя беларускага кнігадруку



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі ў Беларусі Петэр ДЭТМАР, міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чэхіі ў Беларусі Мілан ЭКЕРТ.

**Імя Францыска Скарыны сёння ведае кожны беларус. Яго постаць адна з найяскравейшых у пантэоне духоўнасці нацыі, нашай культуры. Складана нават уявіць, што быў час, калі дасягненні гэтага дзеяча еўрапейскага маштабу, асобы рэнесанснага тыпу нівеляваліся, ім не ўдзялялася належнай увагі. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму ў бібліятэках складана было адшукаць хоць невялічкае выданне пра нашага першадрукара, факты з яго біяграфіі былі вядомыя толькі вузкаму колу навукоўцаў. А пра даступнасць кніг, выдадзеных паўтысячагоддзя таму, магчымасць шырокаму колу знаёміцца з імі і гаворкі не ішло. Забытыя, пакрытыя пылам непатрэбнасці, яны чакалі свайго часу ў сховішчах. І дачакаліся ж!**

Толькі летась і сёлета паліца скарынiяны папоўнілася дзясяткамі новых кніг — ад энцыклапедый для дзяцей да грунтоўных навуковых манаграфій. Спадчына першадрукара — а гэта 25 выданняў — пабачыла свет у факсімільным узнаўленні. Ды і сама постаць Скарыны з Полацка стала не такой чужой, бронзавай і статычнай. Магчыма, справа ў вялікай колькасці мастацкіх праектаў, рэалізаваных напярэдадні гэтага вялікага свята (і шэраг таленавітых прэм'ер нас яшчэ чакае), а можа — у разуменні значнасці і грунтоўнасці ўнёску гэтай Асобы ў сусветную духоўную скарбонку. Хай не з усімі версіямі (некаторыя з іх увогуле фантастычныя) пагаджаюцца навукоўцы-медыевісты, тым цікавей разважаць, думаць, вывучаць.

Сапраўды, на працягу апошніх гадоў зроблена вельмі вялікая работа па даследаванні і папулярызацыі спадчыны першадрукара. І хоць кнігі, манаграфіі, альбомы адзін за адным выходзяць сёлета, праца па іх падрыхтоўцы пачалася намнога раней. Вось і выданне «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» ўжо мае сваю ўласную гісторыю, што доўжыцца каля пяці гадоў. Дыхтоўны фаліянт, падрыхтаваны «Беларускай Энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі, прэзентавалі шырокай грамадскасці краіны акурат напярэдадні знакавага юбілею. Імпрэза прайшла пад светлымі зводамі Нацыянальнага мастацкага музея.

— Наша краіна, якая дала свету шматлікія імёны слынных землякоў, і сёння мае вялікія набыткі. 2017 год для нас — гэта не толькі Год навукі. Як вядома, навука стаіць на падмурку асветы, кнігі, таму год праходзіць пад знакам паўтысячагоддзя беларускага кнігадрукавання. Гэта безумоўна сведчыць пра вялікі клопат дзяржавы пра кнігу, — падкрэсліла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Скарына здзейсніў подзвіг, бо слова дзякуючы яму стала зразумелае простым людзям, яно перасягнула межы краіны. Спадчына першадрукара — неўміручы подзвіг Беларусі, беларусам і ўсяму чалавецтву ў цэлым. Мы і сёння імкнёмся да ўзаемапавагі, міралюбства, справядлівасці. Многія з каштоўнасцяў, закладзеныя 500 гадоў таму ў кнігах першадрукара, не страцілі актуальнасці і ў наш час. У гэты год беларуская кніга шмат вандравала і яшчэ павандруе. Мы пабывалі ў Вільнюсе, Празе, Парыжы, рыхтуемся да прадстаўлення нацыянальнага кнігавыдання ў Кітаі, Сербіі, Германіі. Вельмі знакава, што паводле традыцый свае стасункі мы ўмацоўваем менавіта праз слова.

Так, кніга «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» паказвае, што постаць нашага земляка знакавая для культуры ўсяго свету, а яго здабыткі цэняць і вывучаюць на розных кантынентах. Як расказаў **укладальнік выдання, адзін з аўтараў тэксту, вядомы скарыназнаўца, кандыдат культуралогіі, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША**, усе пяць гадоў, што доўжылася работа па выяўленні, апісанні і даследаванні скарынаўскіх фаліянтаў, вялася актыўная перапіска з калегамі з розных краін. А ў падрыхтоўцы праекта прынялі ўдзел дзясяткі спецыялістаў з Расіі, Украіны, Германіі, Вялікабрытаніі, Даніі, ЗША, Літвы, Польшчы, Славеніі, Чэхіі — у кніжніцах гэтых краін сёння захоўваюцца арыгіналы скарынаўскіх выданняў.

Госці прэзентацыі звярталі ўвагу на розныя аспекты спадчыны Францыска Скарыны. Яго здабыткі важныя не толькі ў галіне распаўсюджвання інфармацыі, мастацкага перакладу, але, як зазначыў **рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаіл БАРАЗНА**, Скарына заклаў асновы кніжнай культуры ў цэлым — гэта і падрыхтоўка цэласнага макета, ілюстрацый, культура прадстаўлення тэксту ў выданні. А **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чэхіі ў Беларусі Мілан ЭКЕРТ і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі ў нашай краіне Петэр ДЭТМАР** былі адзінадушныя ў меркаванні, што вельмі лёгка будаваць стасункі паміж краінамі, якія маюць агульных герояў. Скарына, клопат пра кнігу і рэвалюцыя свядомасці, перадачы інфармацыі сапраўды служаць масткамі паміж многімі народамі. І сёння, у час, калі ўладарыць слова віртуальнае, варта памятаць пра важнасць слова друкаванага, не страціць культуру кнігі і гэтага фармату чытання.

Фаліянт «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» можна назваць сапраўдным энцыклапедыяй, даведнікам па кнігах першадрукара. Тут падаюцца выявы старонак з розных асобнікаў, апісанне кожнай з кніг, месца і значэнне старадрукаў у спадчыне друкара і агульнанароднай. Падобныя выданні служаць вельмі важнай справе: яны паказваюць, што кнігі Скарыны — не нейкія міфічныя фаліянты, схаваныя далёка ад вачэй простых беларусаў, але і скарб, дакрануцца да якога можа кожны беларус.

Хоць выданне пабачыла свет параўнальна нядаўна, яно ўжо адзначанае на прэстыжных прафесійных конкурсах. Так, «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» атрымала Гран-пры міжнароднага конкурсу дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі — 2017» і Гран-пры Еўразійскай міжнароднай кніжнай выстаўкі Eurasian Book Fair — 2017.

Памылкова будзе лічыць, што святкаваннем вялікага юбілею кнігадрукавання справа завершыцца. Наперадзе — яшчэ многа адкрыццяў, прэзентацый, імпрэз. Імя і слова Скарыны будуць гучаць падчас Дня беларускага кнігадрукавання ў яго родным Полацку, а пра яго спадчыну і адкрыцці яшчэ раз згадаюць на вялікім міжнародным кангрэсе, што пройдзе ў сярэдзіне верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы. Гэтыя дата і постаць знакавыя для ўсіх нас, дык святкуйма ж разам!

Спалучыць гісторыю і сучаснасць, зрабіць кнігу актуальнай, але захаваць дух 500-гадовай мінуўшчыны, захаваць дробныя дэталі, разам з тым ахапіўшы шырокі комплекс фактаў. З гэтымі супярэчлівымі задачамі выдатна справіліся аўтары, а выдаўцы змаглі зрабіць сам фаліянт прыцягальным, грунтоўным, але не груваскім.

— За дапамогу ў стварэнні гэтай кнігі мы ўдзячныя супрацоўнікам тых бібліятэк, музеяў краін, дзе захоўваюцца скарынаўскія выданні, — дадае **дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ**. — Многія выдатныя спецыялісты садзейнічалі падрыхтоўцы фотаздымкаў, давалі кансультацыі і парады. Кніга «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» яшчэ раз засведчыла, што Беларусь — еўрапейская краіна, якая годна заняла свой пачэсны пасад між народамі. У многім дзякуючы друкаванай кнізе ў гістарычнай перспектыве і стаўленнем да кнігавыдання ў сучаснасці.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Вернісаж

# МАСТАЦТВА З КЕЛЛЯЎ

## На «Скарынэры» ў Друі створана 150 новых работ



Настаяцель прыхода Найсвяцейшай Тройцы ў Друі, арганізатар пленэру айцец Сяргей СУРЫНОВІЧ.

**Тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання атрымала цікавае ўвасабленне ў Друі, што на Браслаўшчыне. Там, на мастацкі пленэр, які сёлета адмыслова названы «Скарынэр», сабраліся творцы з розных куткоў краіны. Разам яны пісалі партрэт... Францыска Скарыны, стваралі іншыя цікавыя палотны, якія сімвалічна раскрываюць паўтысячагадовы юбілей. Карэспандэнт "Звязды" пагутарыла з арганізатарам пленэру Сяргеем Сурыновічам — настаяцелем прыхода Найсвяцейшай Тройцы ў Друі. Айцец Сяргей распавядае:**

«Друйскі мастацкі пленэр узнік як жаданне дыялогу паміж мастацтвам і рэлігіяй, будаўніцтва мастоў, пошук супольнай гамы, дэталізацыі адценняў сумоўя. Час удзелу ў пленэры ў Друі для мастакоў — гэта час не толькі інтэнсіўнай працы над мастацкімі творамі, але і духоўных пошукаў.

2017 год з'яўляецца асаблівым. 500 гадоў таму беларусы атрымалі першую друкаваную кнігу. Гэта не быў пераклад філасофскіх вучэнняў Арыстоцеля, ці медычных трактатаў Ісхака ібн Хунайна. Гэта была кніга, што злучыла ў сабе і спрадвечную мудрасць, і ацаленне разам — Біблія! Сёлетні летні Друйскі мастацкі пленэр не можа не ператварыцца ў СКАРЫНЭР, не ўзняць тэму важнай падзеі і гонару для нашай нацыі — перакладу Бібліі Францыскам Скарынам.

У якасці адмысловага натуршчыка на мастацкі пленэр быў запрошаны слынны рэканструктар з Мінска, гісторык і дзіцячы пісьменнік Юрый Усціновіч. На думку мастакоў, Юрый Усціновіч вельмі падобны да беларускага першадрукара. Разам з натуршчыкам было дастаўлена адзенне часоў Скарыны і адпаведныя атрыбуты.

З Глыбокага ў Друю прывезлі і рэквізіт — сапраўдны друкарскі станок Іагана Гутэнберга, сучасны Скарыну, выраблены майстрам Вячаславам Дзмітровічам.

Наш мастацкі пленэр сёлета адбыўся трэці раз, але ад самага пачатку ён трапіў у поле зроку выдатных творцаў нашай краіны. У гэтым годзе дзея набыла статус міжнароднай, у ёй прынялі ўдзел мастакі з Расіі і Галандыі. Пленэр у Друі незвычайны як адносна месца правядзення — мастакі жывуць у кельлях XVII стагоддзя, — так і колькасці творцаў, напрыклад, сёлета ў пленэры ўзялі ўдзел трыццаць жывапісцаў. Адметна, што разам з мэтрамі беларускага мастацтва і выкладчыкамі жывапісу ў творчым працэсе прымалі ўдзел таксама навучэнцы Акадэміі мастацтваў. Адборам мастакоў штогод займаецца мастачка Вольга Куваева. Першым крытэрыем удзелу ў пленэры з'яўляецца талент мастака і свабода самавыяўлення. З 70-ці заявак і імёнаў адбіраюцца найлепшыя і найбольш цікавыя стваральнікі сучаснага беларускага мастацтва, што ўжо заявілі пра сябе гледачу, ці чые імёны стануць вядомымі, на нашу думку, у найбліжэйшы час.

Мастакі, запрошаныя на пленэр, працуюць у самых розных тэхніках і кірунках. Гэта перш за ўсё алей на палатне, але таксама графіка, акварэль і пастэль. Мы рады бачыць работы, выкананыя ў авангардзе і рэалізме, сімвалізме і абстракцыі... Усяго напісана каля 150 твораў.



Каленснікава Валянціна. «Свята існасці».

На палотнах, што паўсталі падчас пленэру, мы можам спыніць свой зрок і на Скарыну, якога пісала з натуршчыка ў адпаведных строях Людміла Кальмаева, Таццяна Уласевіч, Настасся Полазава і іншыя мастакі, на вобразным прадстаўленні беларускай зямлі і літар Скарыны Аляксея Залезіна, раскрытай кнізе Валянціны Калеснікавай, але таксама і на вобразах прыгажосці беларускай прыроды, якой захапляемся на палотнах Уладзіслава Пятручыка, Кацярыны Говен, Настассі Бурко. Гэта ў сукупнасці, на мой погляд, і раскрывае тэму першадрукара, які з любоўю да сваёй Радзімы і народа, чэрпаючы сілы і моц з родных мясцін, палёў, кветак, рачулак і крынічак, дае беларусам Слова Божае на роднай мове, не толькі друкуючы яго на папяровых старонках, але передае праз гісторыю на вякі гонар і веліч усёй нашай нацыі.



Полазава Настасся. «Францыск Скарына. XXI стагоддзе».

Адну з работ, абраную арганізатарамі ў кожнага з мастакоў, удзельнікі перадаюць мне асабіста як падарунак. Я стараюся арганізоўваць на працягу года выставы ў розных гарадах і мястэчках нашай краіны. Так, карціны, што засталіся з гэтага пленэру, найбліжэйшым часам можна будзе ўбачыць у галерэі Чырвонага касцёла ў Мінску. Некаторыя работы з папярэдніх пленэраў будуць перададзены дабрачынна медыцынскім ці школьным установам».

На 6 жніўня запланаваны адмысловыя мерапрыемствы па ўсіх касцёлах і парафіях Беларусі. Урачыстае святкаванне 500-годдзя беларускай Бібліі адбудзецца ў нядзелю ў 12.00 у скверы імя Эдварда Вайніловіча каля Чырвонага касцёла ў Мінску, пасля святой імшы (у галоўным храме) ды Боскай літургіі (у ніжнім храме), якія служацца а 11-й гадзіне. У свяце прымуць удзел прадстаўнікі хрысціянскіх канфесій Беларусі. Запланаваны таксама выстаўкі, прэзентацыі кніг хрысціянскіх выдавецтваў, выступленні духавенства, вучоных, пісьменнікаў і іншае.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ А вы ведалі?

# НЕ «ПСАЛТЫР», А «АПОСТАЛ»

## З якіх меркаванняў «чатырохсотлецьце» беларускага друку адзначалі ў... 1925 годзе

**Гэта сёння ў Беларусі пра Скарыну і значэнне яго асветніцкай дзейнасці для нашага народа, якую інакш чым подзвіг і не называем, ведаюць усе. І юбілей ягонай першай кнігі адзначаем як нацыянальнае свята. Складана паверыць, што яшчэ сто гадоў назад імя Францыска Скарыны было для беларусаў фактычна невядомым...**



Язэп Драздовіч напісаў партрэт Скарыны таксама да «чатырохсотлецьця», у 1925 годзе.

А яно насамрэч так і было. Першая публікацыя пра Скарыну па-беларуску з'явілася ў 1909 годзе — гэта была невялікая замалёўка Сяргея Палуяна ў «Нашай ніве» пад назвай «Калі друкавалася першая беларуская Біблія». Замалёўка па сутнасці сваёй невялікая і ніякага адкрыцця для сучаснага чытача не змяшчае. Але адкуль Палуян, па сутнасці, сямнаццацігадовы юнак, няхай сабе і досыць адукаваны, валодаў нават такой, з пункту гледжання сённяшняга невялікай, інфармацыяй?

— Палуян мог ведаць гэта з некалькіх крыніц, і тут мог прыкласці руку Вацлаў Ластоўскі, які тэмай вельмі цікавіўся і заказваў артыкулы на яе розным аўтарам, — тлумачыць **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, скарыназнаўца Алесь СУША.** — Дакладна вядома, што менавіта ён заказаў артыкул пра Скарыну Максіму Багдановічу. Вынікам стаў грунтоўны артыкул «Беларускае адраджэнне» — гэта быў своеасаблівы ўступ да тэмы ўласна кнігадрукавання, які можна лічыць пачаткам беларускай культуралогіі. Багдановіч, як вядома з дакументаў, напісаў артыкул і ўласна пра Францыска Скарыну. Гэта праца не была апублікаваная, рукапіс захоўваўся ў Інстытуце беларускай культуры, а потым у Акадэміі навук, але на гэты час яго месцазнаходжанне невядома, хутчэй за ўсё, ён быў знішчаны падчас вайны... Пісаў матэрыялы пра Скарыну і сам Ластоўскі, і Максім Гарэцкі, прычым яны згадвалі, што ў 1917-м — 400-гадовы юбілей беларускай кнігі... Але гэта была драбяза ў параўнанні з тымі навуковымі працамі па жыцці і дзейнасці Скарыны — манаграфіямі, дысертацыямі, — якія ўжо існавалі за мяжой, — у Польшчы, Расіі, Чэхіі. Беларусы пачалі адкрываць для сябе Скарыну ў той час, калі ўся Еўропа ўжо даўно аб ім ведала.



Пэўна, укладальнікі кнігі стылізавалі афармленне кожнай часткі пад Скарынавы гравюры з савецкай рэчаіснасцю, каб адцягнуць увагу цэнзараў ад сапраўдных гравюр першадрукара.

Калі ж настаў уласна 1917-ы — было не да юбілею кнігі, няхай сабе і чатырохсотгадовай. Пасля грамадзянская вайна, Рыжскі мір, які раскідаў народ па розных дзяржавах. Але рупліўцы нацыянальнай беларускай ідэі не забыліся пра імя чалавека, які мог стаць асноўнай постаццю гэтай ідэі. У 1924 годзе, як вядома, пачаўся нядоўгі, але вельмі важны для нашай гісторыі перыяд беларусізацыі. Тут жа і ўзнікла думка на самым высокім узроўні ўшанаваць імя Скарыны і яго асветніцкую дзейнасць, каб народ, які яшчэ да нядаўняга часу лічылі забітым і непісьменным, горда ўзняў галаву, дазнаўшыся, што адным з першых у Еўропе атрымаў калісьці сваю друкаваную кнігу... Але ж такі прыгожы і рэдкі юбілей ужо сем гадоў як мінуў...

Выйсце знайшлося, і цалкам лагічнае. Вырашылі адзначаць юбілей першай беларускай кнігі ў 1925 годзе. Было зроблена даволі слушнае абгрунтаванне, што пражскія выданні — гэта не зусім беларускае кнігадрукаванне. А вось кнігадрукаванне на беларускіх землях — гэта выданне ў Вільні «Малой падарожнай кніжкі» і «Апостала». (У 20-я гады дакладна была вядома толькі дата выдання «Апостала», заўважае Алесь Суша).

Навуковую канферэнцыю ў снежні 1925 года праводзіў Інбелкульт, і гэта было настолькі ярка, што нават гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі святкавалася ў межах юбілею кнігадрукавання. Прайшла канферэнцыя на самым высокім узроўні, усё кіраўніцтва БССР прымала ў ёй удзел. Дзякуючы гэтаму падзея атрымала шырокі рэзананс у тагачаснай прэсе. Вынікам яе стаў зборнік «Чатырохсотлецьце беларускага друку» — комплексная праца некалькіх навукоўцаў. Тэмы даследавалі спецыялісты ў сваёй галіне. Уладзімір Пічэта напісаў артыкулы пра Полацкую зямлю ў часы Скарыны, пра беларускае адраджэнне, пра друк на Беларусі ў XVI—XVII стагоддзях. Мікола Шчакаціхін даследаваў гравюры ў скарынаўскіх выданнях. Язэп Воўк-Левановіч — мову яго кніг...

— Настолькі грунтоўнай калектыўнай манаграфіі, прысвечанай Скарыну, пасля гэтай, бадай, і не было, — лічыць Алесь Суша. — Канешне, некаторыя тагачасныя гіпотэзы не пацвердзіліся, выявіліся і фактычныя памылкі. Але гэта праца з агульнай канцэпцыяй, з закончанай кампазіцыяй. Многія з пытанняў, у ёй вывучаных, дагэтуль глыбей не аналізаваліся...

Трымаю ў руках гэта выданне, датаванае 1926 годам. На пажаўцелых старонках — крыху непрывычная мова дарэформеннага правапісу. Сапраўды, праца грунтоўная: не толькі пра Скарыну, але і пра час, у які ён жыў і працаваў. Тут і гуманізм у Італіі, і артыкул пра Падуанскі ўніверсітэт, і пра тагачасныя Полацк і Вільню — нібы трапляеш у скарынаўскую эпоху. Скарыніяна — гісторыя вывучэння скарынаўскай спадчыны замежнымі, у прыватнасці расійскімі, даследчыкамі. Найцікавейшыя факты дазнаешся: напрыклад, як знайшоўся арыгінальны «Псалтыр», той самы, 1517 года, — яго маскоўскі калекцыянер Хлудаў купіў на ніжагародскім кірмашы...

Асаблівую ўвагу прыцягваюць ілюстрацыі. У якасці аздаблення кожнай новай працы выкарыстаныя фрагменты Скарынавых гравюр з дамаляванай... савецкай сімволікай. Артыкул Антона Ясінскага аб культурным жыцці Чэхіі вянчае вядомае «Сонца маладзіковае», якое плячыма падпіраюць беларускія сяляне — дзяўчына ў андараку і хлопец у лапцях. Наступную працу — Мацея Любаўскага пра Літоўска-беларускую дзяржаву XVI стагоддзя — тыя ж хлопец з дзяўчынай каля серпа і молата. А «Skoriniana» Уладзіміра Пічэты мае «ў галавах» і сонца з месяцам, і серп з молатам.

Пэўна, гэткая стылізацыя была прыёмам адцягвання ўвагі цэнзараў ад галоўнага — ад сапраўдных гравюр Скарынавых кніг, якія ў якасці ілюстрацыі да работы Мікалая Шчакаціхіна змешчаны ў вялікай колькасці і без «фоташопа» — на іх ва ўсёй красе і біблейскія героі, і рагаты нячысцік з хвастом, і светлы, з промнямі вакол, твар Хрыста...

Увогуле, тое, што святкаванне, звязанае з імем Скарыны, адзначалася на высокім дзяржаўным узроўні ў той час, як па краіне гуляў ваяўнічы атэізм, — факт, калі задумацца, унікальны... Бо Скарына, канешне, асоба, але якія кнігі ён друкаваў? Біблію! У тыя часы адно гэта слова выклікала адпаведную рэакцыю... Але ўвага на рэлігіі зусім не акцэнтавалася, звярталіся найперш да кніжнай тэмы. Асноўным пасылам зрабілі асветніцтва Скарыны, што ў час барацьбы з непісьменнасцю было надзвычай актуальным.

Трэба сказаць, што «чатырохсотлецьце» адзначылі і па іншы бок мяжы — у Коўне, тагачаснай сталіцы Літвы, на грошы літоўскага ўрада Вацлаў Ластоўскі выпусціў зборнік «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі». У 1926 годзе ён ужо вярнуўся ў БССР з тыражом гэтай кнігі, акурат пад святкаванне, бо яно пачалося ў канцы 1925 года і працягвалася ўвесь 26-ы... Быў аб'яўлены і конкурс сярод мастакоў (славуты партрэт Скарыны Язэп Драздовіч напісаў у 1925 годзе акурат для яго).

А ў савецкай Беларусі юбілей кнігадрукавання быў фактычна кульмінацыяй беларусізацыі. Да юбілею ў ленінградскага калекцыянера Камарніцкага купілі дзесяць Скарынавых кніг. У 1925 годзе ў Мінску з'явілася вуліца імя Скарыны (перайменавалі Казьмадзям'янаўскую, яна была паміж Верхнім і Ніжнім горадам, цяпер не існуе). БДТ-3 паставіў п'есу Міхаіла Грамыкі, прысвечаную Скарыну, тэкст якой, на жаль, не захаваўся да нашых дзён. У Полацку нават паставілі фундамент помніка, але сам помнік адліць не паспелі...

...А пасля насталі іншыя часы. Ужо ў 1927 годзе Вільгельм Кнорын, які ў той час быў першым сакратаром беларускай кампартыі, назваў Скарыну царкоўнікам, ледзь не манахам. Мінскую вуліцу вельмі хутка перайменавалі ў вуліцу Дзям'яна Беднага. Навукоўцы, што пісалі кнігу, ужо ў пачатку 30-х апынуліся ў ссылцы ці лагерах...

Але для наступных пакаленняў засталося галоўнае веданне: у нас ёсць Скарына. У нас ёсць свая кніга на нашай мове, якую мы мелі нашмат раней, чым многія суседзі. Мы — еўрапейскі народ, які здаўна жыў прынцыпамі асветы і гуманізму.

І гэта веданне — важкая нагода ўспомніць добрым словам тых, хто даў нам тое «чатырохсотлецьце». Успомніць акурат цяпер, калі 500-годдзе кнігадрукавання адзначаем на дзяржаўным узроўні як нацыянальнае свята.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*



Ілюстрацыя падпісана так: «Тройца» на адвароце загалоўнага аркушу праскае Біблії».

# «МАЯ СКАРЫНІЯНА»

## АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ ДРУГОГА ТУРА

**Мы наўмысна крыху зацягнулі з публікацыяй адказаў на пытанні другога тура, даўшы вам яшчэ крыху падумаць. І не памыліліся, бо некалькі пісьмаў атрымалі менавіта ў апошні тыдзень. Так, некаторыя пытанні ў нас «закручаныя», часам складаныя, але ж ніхто не абяцаў, што будзе лёгка. Да таго ж што за цікавасць разгадваць тыя, адказ на якія знойдзеш па першым «кліку» ў сеціве, праўда?**

**Што ўдзельнікі віктарыны не да гэтага імкнуцца, відаць па вашых допісах. Памылкі, канешне, сустракаюцца, але іх няшмат. Так што барацьба разгараецца не на жарт і вырашальным будзе трэці, апошні тур.**

**Яго пытанні мы прапануем вам на наступным тыдні. А пакуль звярайце свае адказы на пытанні другога, і калі яны правільныя — вашы шанцы трапіць на бясплатную адмысловую экскурсію па Нацыянальнай бібліятэцы значна павялічваюцца.**

**1.** *Вядома, што ў Вільні Скарына друкаваў свае кнігі ў доме Якуба Бабіча. А хто быў гаспадар дома па родзе заняткаў?*

Якуб Бабіч быў **гарадскім бурмістрам.**

**2.** *У якой навучальнай установе змешчана гэта фрэска з выявай Францыска Скарыны?*



Гэта фрэска змешчана ў Італіі, у мемарыяльнай зале **Падуанскага ўніверсітэта**, дзе Францыск Скарына ў 1512 годзе атрымаў ступень доктара лекарскіх навук.

**3.** *Хто з беларускіх дзеячаў у 20-х гадах XX стагоддзя напісаў пра Скарыну наступнае: «Ваганне паміж Захадам і Усходам і шчырая непрыхільнасць ні да аднаго, ні да другога з'яўляецца асноўнаю адзнакаю гісторыі беларускага народа. Прыклад Скарыны, аб якім да гэтай пары няведама, хто ён быў такі, ці каталік, ці праваслаўны, і пэўна, што і той, і другі разам, адбівае гэтае з'явішча беларускага духу ў індывідуальнасьці, у душы нашага першага інтэлігента».*

Так называў Скарыну **Ігнат Абдзіраловіч** у сваім праграмным эсэ «Адвечным шляхам».

**4.** *Праз 350 гадоў пасля выдання, у 1867 годзе, пражскі «Псалтыр» Скарыны быў куплены рускім аматарам старадрукаў Хлудавым, і гэта дало падставу рускім навукоўцам паглядзець на асобу Скарыны і яго дзейнасць з новай цікавасцю. А дзе купіў Хлудаў такую рэдкую кнігу?*

Як сведчыць Уладзімір Пічэта ў артыкуле «Skoriniana», змешчаным у кнізе «Чатырохсотлецьце беларускага друку», выдадзенай у 1926 годзе, «Псалтыр» купілі **на Ніжагародскім кірмашы**. Спасылаецца гісторык пры гэтым на работу А. Віктарава «Замечательное открытие в русском книжном мире», апублікаваную ў Маскве ў 1867 годзе.

**5.** *Адзін з томікаў Скарынавых кніг, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, асабліва цікавы — адразу некалькі выданняў першадрукара сплецены ў адзін пераплёт. Што гэта за выданне?*

У такім арыгінальным пераплёце ў нас захоўваецца **Кніга Царстваў.**

**6.** *У якім годзе ў Беларусі шырока адзначалі 400-годдзе беларускага кнігадрукавання?*

**У 1925-м.**

**7.** *У якім беларускім горадзе вышэйшая навучальная ўстанова носіць імя Францыска Скарыны?*

**Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны.**

**8.** *На якой плошчы ў Полацку стаіць помнік Францыску Скарыну?*

Помнік стаіць на **плошчы Францыска Скарыны.**

**9.** *А дзе стаіць гэты помнік?*



Помнік Францыску Скарыну **ў Празе**, у раёне Градчаны, быў пастаўлены ў 1996 годзе. Вышыня яго разам з гранітным п'едэсталам больш за два з паловай метры.

**10.** *Пытанне ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.*

*Калі і дзе ўзнікла другая пасля Скарынавай друкарня ў Вялікім Княстве Літоўскім?*

Другая ў ВКЛ і першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі друкарня з'явілася **ў Бярэсці ў 1553 годзе.** Яна была арганізавана пад заступніцтвам Мікалая Радзівіла Чорнага, берасцейскага старосты, віленскага ваяводы і канцлера Вялікага Княства Літоўскага.

■ Меркаванне

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было Слова

**А што, калі б Скарыны не было?..**

# ДАЎ НАМ ХЛЕБ

**Для кожнага з нас постаць Францыска Скарыны і тое, што ён зрабіў, значаць штосьці сваё. Хтосьці захапляецца яго прадмовамі, іншы натхняецца біяграфіяй першадрукара, некаторыя бывалі ў тых жа, што і ён, мясцінах. Ёсць і такія, хто думае, нібыта з Францыскам ніяк не звязаны... Аднак насамрэч гэта асоба моцна паўплывала на нашу культуру, на лад жыцця.**

**...Часам хочацца пагуляць у антыўтопію і падумаць, а што было б, калі б Скарына не зрабіў таго, што ён зрабіў? Што было б, калі б Францыск усё жыццё быў заняты нейкай іншай справай, напрыклад лекарствам? Як бы тады развівалася наша гісторыя?.. Спробу асэнсавання нашага мінулага, пачынаючы з 500-гадовай даўніны, — са Скарынам і без яго — мы зрабілі разам са знанымі даследчыкамі, людзьмі сапраўды апантанымі першадрукаром!**



**«Галоўны фагатыст» краіны, дырыжор, складальнік музычнай праграмы да 500-годдзя беларускай Біблії з прысвячэннем Францыску Скарыну, Аляксей ФРАЛОЎ:**

— Скарына падарыў беларусам кнігу, галоўную кнігу! Для мяне гэта найважнейшая асоба ў нашай культуры за 1000 гадоў! Каб не было анічога і анікога яшчэ ў беларускай гісторыі, а быў толькі ён — ужо можна было б сказаць, што беларускі народ «быў, ёсць, будзе»!

Скарына — найпрыгажэйшы рэнесансны партал у нашу гісторыю, гледзячы праз які сучаснаму беларусу ўжо ня трэба мучыцца комплексамі «непаўнавартасці». Ён — высокі партал у свет перадавога еўрапейскага Рэнесансу — у культуры, навуцы, усёй свядомасці. Наш герой — велічны партал у духоўнае, адукаванае, прагрэсіўнае (не фармальнае) хрысціянства, у біблеістыку, у саму Біблію на зразумелай ужо, блізкай роднай мове.

Скарына — гэта наш манументальны культурны мост паміж Полацкам і Вільняй з аднаго боку і Кракавам ды Прагай, Падуяй ды Венецыяй з другога, паміж Беларуссю і Захадам.

Памятаю, завяршаючы год Агінскага, наша вялікая культурная дэлегацыя з Беларусі разам з ансамблем салістаў «Вытокі» ехала ў Фларэнцыю. Па дарозе мы не маглі абмінуць славутую Падую... Тады як уся група ўжо выйшла з той самай залы, дзе Скарына абараняўся як двойчы доктар Падуанскага ўніверсітэта, нам з калегамі па ансамблі, дзеля нейкай асаблівай павагі, дазволілі застацца і пасядзець на тых самых легендарных месцах і нават там сфатаграфавацца...

Што, каб Скарыны не было б? Да XVI стагоддзя ў нас мелася б тая ж старажытная культура, сярэднявечная гісторыя, гатычнае мастацтва. А вось Рэнесанс ужо быў бы не такі... Неба стала б іншым, каб на ім раптам знікла самая яркая зорка галактыкі!.. А пазнейшыя творцы наступных эпох не мелі б такой апоры, такога арыенціра, такой «пуцяводнай зоркі», як «сонца маладзіковае»!



**Прафесар, пісьменнік, даследчык дзейнасці Скарыны Адам МАЛЬДЗІС:**

— Калі б Скарына не даў беларускаму народу на яго старабеларускай мове кнігі — гэта ўсё адно як не даць хлеб чалавеку! Мы апярэдзілі многіх і чацвёртымі ў свеце атрымалі Біблію на нацыянальнай мове.

Пару гадоў таму ў Парыжы я ўдзельнічаў у канферэнцыі ЮНЕСКА, якую праводзіў Іран (ужываюць арабскі алфавіт). І вось для іх самай вялікай сенсацыяй было, калі я дастаў адну з кніг, выдадзеную ў нас, дзе пад адной вокладкай надрукавана Біблія на беларускай мове, але напісаная арабскай вяззю, а ўнізе — па-беларуску. За аль-кітабы мне прапаноўвалі надзвычай вялікія грошы, але я не змог іх прадаць.

Калі б Скарына не выдаў Біблію ў свой час, мы б дагэтуль жылі ў паганстве. Лёс чалавечы развіваецца так, што цяжка сказаць, што было б. Пэўна ж, было б дрэнна. Бо чым бліжэй чалавецтва ведала Слова Божае, тым яму было лепей. Калі Слова Божае патрэбна чалавеку, а ён яго не ведае, то, значыць, ён не спасцігнуў і пэўную ісціну...



**Паэт, аўтар кнігі перастварaных прадмоў Скарыны «Маем найбольшае самі» Алесь РАЗАНАЎ:**

— Скарына прамаўляе да нас з глыбіні стагоддзяў, ён над палітыкай, над эканомікай, над канфесіямі, над падзеламі на творчыя саюзы, над асабовымі стасункамі. За гэтыя вякі шмат змянілася, шмат адбылося, але таму, што ён сказаў сваё слова, мы гаворым з ім, уваходзім з ім у размову.

Я пачаў чытаць Скарыну — яго прадмовы і пасляслоўі, — і тэксты пачалі адгукацца. У іх нешта было — яны гаварылі, прамаўлялі, адгукаліся, у іх была паэзія. Калі пільна ўчытвацца ў прадмову да «Псалтыра», першай кнігі, з якой Скарына пачынаў выдавецкую дзейнасць, то словы там суадгукаюцца, аб'яўляюцца, нават пяюцца. Вазьміце які-небудзь пасаж з прадмовы да Псалтыра, складзіце гэтыя радкі ў слупок — і выявіцца верш...

У сваёй творчасці я выйшаў за межы сілаба-танічнай сістэмы вершаскладання, знадворнае не засланяла ўнутраны змест, а ўнутраны змест Скарынавых прадмоў паэтычны. Адчуў гэта, заўважыў, захапіўся і недзе ў сярэдзіне 1980-х гадоў пачаў перастварaць іх на сучасную беларускую мову... А сёлета вынікам працы стала кніга «Маем найбольшае самі»...

Ёсць законы фізічныя і надфізічныя, а чалавек — не толькі цела, а яшчэ нешта, што не менш істотна за само цела, — душа, дух і нават сам Бог... Ведаць, разумець — гэта мала, трэба, каб веды пераходзілі ў веру. Веды і вера блізкія, але ў веры свеціцца наступнасць. Наступнасць — гэта выйсце з сябе. Ведаў недастаткова, патрэбна нешта яшчэ, каб увайсці ў наступнасць, і Скарына гаворыць пра гэта неабходныя словы — мякка, разважна, далікатна, як настаўнік. Пераказвае вядомае альбо пачутае, зведанае, прачытанае — але робіць гэта на новым узроўні, мае адметную інтанацыю. Справа асветніцтва мусіць доўжыцца, набываць новае аблічча і новыя выяўленні. Скарына падыходзіў да боскіх ісцін — і цяпер мы падыходзім да Скарыны.

Мы жывём у пераломным часе і маем патрэбу ў вяршынях, куды скіроўвацца душою, бо калі не зможам узняцца, то і не выканаем нейкай сваёй ролі, дзеля якой пакліканы ў гэты свет.



**Аўтар кнігі «Залаты век Беларусі», пастар царквы «Ян Прадвеснік» Антоній БОКУН:**

— Напачатку я вельмі скептычна ставіўся не тое каб да культу Скарыны, але да прыўзнясення гэтай асобы. Але чым больш сутыкаўся з вынікамі яго працы (асабліва апошнія 20 гадоў, робячы ўласныя пераклады Бібліі), уражваўся веліччу асобы. Бо ён зрабіў тытанічную працу, арганізаваўшы пераклад Бібліі і выданне біблейных кніг. Нават на сённяшні дзень гэта даволі няпростая праца, якая патрабуе вялікіх як часавых, так і матэрыяльных рэсурсаў. Тое, што зрабіў Скарына 500 гадоў таму — сапраўды тытанічны ўчынак.

Гаворачы пра Францыска, цяжка сказаць штосьці большае за тое, чаго ён насамрэч варты. Ад усякай працы ёсць карысць. Акурат прыклад Скарыны паказвае, што з цягам часу яна набывае ўсё большае і большае значэнне. Калі ты робіш правільныя рэчы, гэта абавязкова прынясе плён — можа, не такі, як ты чакаў, не тады, калі ты чакаў, але вынік будзе...

У свой час я патрапіў у кавярню «У Францыска». І там на ўваходзе сустрэў Францыска Скарыну, які сядзеў і ці то пісаў, ці то чытаў нешта. Для мяне гэта было вельмі нечакана. Дзе-дзе, а ў рэстарацыі не думаў з ім перасячыся!.. Я бачыў Францыска на фрэсках, на мазаіках, ва ўніверсітэтах, на помніках. А такая сустрэча стала прыемнай нечаканасцю! Ён убачыўся мне як чалавек, а не як помнік...

Скарына зрабіў дзве важныя рэчы: пераклаў Біблію і надрукаваў яе. Уся гісторыя сведчыць, што гэта немагчыма зрабіць аднаму чалавеку. Мусілі быць аднадумцы, якія падтрымлівалі і дапамагалі яму. Таму можна сказаць, што, калі б гэтага не зрабіў Скарына, то, напэўна, штосьці падобнае зрабіў бы нехта іншы, пазней на 10, 20 гадоў. У той жа час менавіта ён пачаў новую эпоху — тое, што называецца «Залаты век Беларусі». Значную ролю ў тым, што XVI стагоддзе атрымала найбольшы росквіт за ўсю нашу гісторыю, адыграла распаўсюджванне Слова Божага. Іначай гэтае стагоддзе зусім згубіла б свой бляск.

З аднаго боку, гэта мог бы зрабіць хтосьці іншы, але з іншага, яно магло і не адбыцца. Я са свайго вопыту ведаю, што часам адчуваеш, нібы час настаў і нехта мусіць зрабіць пэўную рэч... Але гэта залежыць і ад канкрэтнага чалавека. Здараецца, ёсць патрэба, а няма таго, хто яе выканае. Могуць праходзіць гады... У памерах стагоддзяў яно, верагодна, і адбудзецца. Аднак цэлыя дзесяцігоддзі можа заставацца нявыкана080ым... Калі няма чалавека, які скажа: "Вось я — і я зраблю».

У гэтым сэнсе Скарына — вялікі прыклад для нас. Як таго, хто адгукнуўся і прысвяціў жыццё вялікай справе.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Фотафакт

# ТУЗІН МОЦНЫХ

**У Саюзе пісьменнікаў Беларусі ўзнагародзілі 12 пераможцаў конкурсу «Скарынавай душой узлашчанае слова», прысвечанага 500-годдзю беларускага кнігадрукавання**




**Школьнікі і дарослыя, прагрaмісты і гісторыкі, жыхары сталіцы, маленькіх гарадоў Беларусі і нават замежжа — усіх іх сваім прыкладам натхніў і аб'яднаў сам першадрукар.**

Конкурс, што сёлета быў аб'яўлены Саюзам пісьменнікаў, выклікаў вялікую хвалю цікавасці творцаў. Яны даслалі арганізатарам свае вершы, прозу, казкі на беларускай і рускай мовах. Але склалася так, што ўсе 6 твораў-пераможцаў напісаныя па-беларуску. Увага да конкурсу сталася настолькі шырокай, што аргкамітэт не абмежаваўся толькі вызначэннем лаўрэатаў, але вырашыў прысудзіць яшчэ 6 спецыяльных прызоў.

Як заўважыў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, конкурс ладзіўся з мэтай паказаць адметнасці пісьменніцкай работы, каб праз зварот да ўласнай літаратурнай творчасці яго ўдзельнікі зацікавіліся кнігай і чытаннем у цэлым.

Адметна, што пераможцы атрымалі дыпломы і сімвалічныя статуэткі, якія ў мініяцюры паўтараюць вобраз першадрукара.

**Юзэфа ВОЎК**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Прававая гасцёўня

# Чаргу сіраты па патрэбе ў жыллі

## можна перанесці па месцы яго размеркавання

***Бацькі майго падапечнага загінулі ў ДТЗ. Як сірата ён знаходзіцца на ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у населеным пункце Магілёўскай вобласці, дзе раней жыў з бацькамі. Цяпер ён жыве з намі ў населеным пункце Мінскай вобласці. Як паставіць яго на ўлік па месцы нашага жыхарства?***

***Ірына, Мінская вобласць.***



На пытанне адказвае **Святлана ПАЎЛЮЧЭНКАВА, кансультант упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.**

У населеным пункце Мінскай вобласці ваш падапечны можа быць прыняты на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пры наяўнасці падстаў для прызнання яго такой асобай: па катэгорыі дзяцей-сірот або на агульных падставах.

Пытанні пастаноўкі на ўлік прадугледжаны Палажэннем аб уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і аб парадку давання жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (Палажэнне), якое зацверджана Указам Прэзідэнта Беларусі ад 16 снежня 2013 года №563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін».

Згодна з Палажэннем, грамадзяне маюць права знаходзіцца на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з дня наступлення паўналецця, а ў выпадку эмансіпацыі або ўзяцця шлюбу да дасягнення паўналетняга ўзросту — з даты рашэння аб эмансіпацыі ці ўзяцця шлюбу. Права на пастаноўку на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, можна рэалізаваць па месцы жыхарства або работы (службы).

У дачыненні дзяцей-сірот Палажэнне вызначае асаблівы падыход пры пастаноўцы на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Яны маюць права знаходзіцца на ўліку грамадзян, якім патрабуецца паляпшэнне жыллёвых умоў, з даты першапачатковага набыцця імі статусу дзяцей-сірот. У выпадку смерці бацькоў, якія стаялі на такім уліку, — з даты іх пастаноўкі на ўлік у складзе сям'і бацькоў пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных Палажэннем.

На ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, дзяцей-сірот прымае мясцовы выканаўчы і распарадчы орган па месцы першапачатковага набыцця статусу дзяцей-сірот або мясцовы выканаўчы і распарадчы орган па месцах іх работы (службы), якое дадзена па размеркаванні, накіраванні на работу адпаведна з дагаворам мэтавай падрыхтоўкі спецыяліста (рабочага, служачага).

Калі грамадзянін стаіць на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па катэгорыі дзяцей-сірот у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе па месцы першапачатковага набыцця статусу дзяцей-сірот, то да спаўнення яму 23 гадоў, ён можа скарыстацца правам пастаноўкі на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе па месцы работы (службы), калі яно дадзена па размеркаванні, накіраванні на работу адпаведна з дагаворам мэтавай падрыхтоўкі спецыяліста (рабочага, служачага) пры ўмове зняцця з уліку па месцы першапачатковага набыцця статусу дзяцей-сірот.

Ваш падапечны можа быць пастаўлены на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у населеным пункце Мінскай вобласці наступным чынам:

— па катэгорыі дзяцей-сірот — калі пасля навучання і да спаўнення яму 23 гадоў у гэтым населеным пункце яму будзе прадастаўлена работа (служба) па размеркаванні, накіраванні на работу адпаведна з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста (рабочага, служачага);

— на агульных падставах з моманту дасягнення паўналецця ваш падапечны мае права звярнуцца з заявай аб пастаноўцы на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, калі ён зарэгістраваны па месцы жыхарства ў гэтым населеным пункце і мае падставу быць прызнаным асобай, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.***

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■

Экалагічны ЛІКБЕЗ
СУМЕСНЫ ПРАЕКТ ЗВЯЗДА

# ЗАПОМНІ САМ І ПЕРАДАЙ КАЛЕГУ ПА ХОБІ

**Чым можа абярнуцца для паляўнічага нявыплата дзяржаўнай пошліны за прадастаўленне права на паляванне? Хто павінны рэгуляваць распаўсюджванне і колькасць баброў на тэрыторыі населеных пунктаў, калі жывёлы раптам з'явяцца на іх? Як рыбаку не трапіць у няёмкае становішча: што трэба ведаць пра дадатковыя — часовыя або пастаянныя, што могуць устанаўлівацца апроч агульнавядомых — забароны на лоўлі рыбы? Сёння кампетэнтныя адказы на гэтыя пытанні ў нашай экалагічнай рубрыцы даюць спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

### На паляванне — пасля выплаты дзяржпошліны

**Грамадзяне пры правядзенні палявання ў абавязковым парадку павінны мець пры сабе сапраўднае дзяржаўнае пасведчанне на права палявання. У адпаведнасці з пунктам 98 Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, пасведчанне з'яўляецца сапраўдным пры наяўнасці карткі ўліку парушэнняў і выплаты дзяржаўнай пошліны з адзнакай альбо з квітанцыяй аб яе выплаце. Картка ўліку парушэнняў і выплаты дзяржаўнай пошліны з'яўляецца неад'емным дадаткам да дзяржаўнага пасведчання на права палявання.**

**Дзяржаўная пошліна выплачваецца да пачатку палявання і пацвярджае права на паляванне на працягу дванаццаці месяцаў з дня яе выплаты.** Памер дзяржпошліны вызначаецца Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь і ўстаноўлены ў памеры адной базавай велічыні (23 рублі на сёння).

Такім чынам, перш чым адправіцца на паляванне, варта звярнуць увагу на тэрмін дзеяння дзяржаўнага пасведчання, а таксама тэрмін дзеяння адзнакі аб выплаце дзяржпошліны або квітанцыі аб яе выплаце.

Адзнака аб выплаце дзяржпошліны робіцца службовымі асобамі «Белдзяржпалявання» або лесагаспадарчых устаноў Міністэрства лясной гаспадаркі, завяраюцца асабістымі подпісамі службовых асоб і штампамі (пячаткамі) гэтых арганізацый.

У выпадку, калі выплата дзяржпошліны пацвярджаецца квітанцыяй аб яе выплаце, паляўнічаму варта звяртаць увагу на наступныя акалічнасці:

— дата плацяжу і тэрмін дзеяння дзяржпошліны (12 месяцаў),

— сума плацяжу павінна складаць не менш за адну базавую велічыню,

— код плацяжу ў любой квітанцыі аб выплаце дзяржпошліны за прадастаўленне права на паляванне — 03003. Прызначэнне плацяжу — дзяржаўная пошліна за прадастаўленне права на паляванне з фізічных асоб. У выпадку, калі ў квітанцыі ўказаны іншы код і прызначэнне плацяжу, дзяржпошліна лічыцца нявыплачанай.

Паляванне з пратэрмінаваным дзяржаўным пасведчаннем на права палявання, з нявыплачанай або пратэрмінаванай дзяржаўнай пошлінай за прадастаўленне права на паляванне з'яўляецца незаконным (без належнага на тое дазволу). Здабытыя ў такіх выпадках паляўнічыя жывёлы з'яўляюцца здабытымі незаконна.

### Калі ад бабра не чакаць дабра...

**З'яўленне бабровага паселішча на тэрыторыі населенага пункта, садаводчага таварыства, дачнага кааператыва або ў непасрэднай блізкасці ад іх можа прынесці сур'ёзныя нязручнасці і непрыемнасці для іх жыхароў. Бабры не толькі могуць прыстасоўвацца да розных умоў пражывання, але і здольныя пераўтвараць навакольнае асяроддзе з улікам сваіх патрэб, у тым ліку змяняць характарыстыкі вадаёма ці вадацёку, берагавой лініі, драўнінна-хмызняковай расліннасці паблізу.**

Норы, хаткі, паўхаткі, плаціны, каналы, лазы і хады — такі пералік збудаванняў баброў. У выніку будаўнічай дзейнасці жывёлы пашкоджваюць дарогі, гідратэхнічныя і іншыя збудаванні, падтопліваюцца ўчасткі і домаўладанні грамадзян.

Акрамя таго, бабры ў населеных пунктах пашкоджваюць пабудовы, знішчаюць пладовыя дрэвы і хмызнякі.

У адпаведнасці з заканадаўствам праблема вырашаецца шляхам правядзення мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці дзікіх жывёл. Як правіла, мерапрыемствы ажыццяўляюцца шляхам арганізацыі бяззброевай здабычы баброў. Спосабы рэгулявання распаўсюджвання і колькасці без вымання жывёл неэфектыўныя, паколькі бабры здольныя ў самыя кароткія тэрміны аднаўляць знесеныя чалавекам плаціны, разбураныя жыллё і іншыя збудаванні. Згодна з Правіламі рэгулявання распаўсюджвання і колькасці дзікіх жывёл, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.01.2008 №126, здабыча дзікіх жывёл у мэтах рэгулявання іх распаўсюджвання і колькасці ажыццяўляецца на падставе дазволаў на адабранне дзікіх жывёл з асяроддзя іх пражывання, якія выдаюцца Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Такія дазволы атрымліваюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы або ўпаўнаважаныя імі арганізацыі. Як правіла, рэгуляванне распаўсюджвання і колькасці баброў на тэрыторыі населеных пунктаў ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі работнікамі карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў.

Нягледзячы на маючыя месца факты нападзення баброў на чалавека, заолагі з упэўненасцю сцвярджаюць, што гэтаму віду млекакормячых не ўласцівая агрэсія да чалавека. Разам з тым варта праявіць асцярожнасць пры сустрэчы з бабром, тым больш, калі жывёла не баіцца чалавека. Прыкладам гэтаму служыць выпадак, які адбыўся ў 2013 годзе ў Камянецкім раёне, калі бабёр напаў на цікаўнага рыбалова.

Бабрам уласцівыя варожыя паводзіны ў адносінах да сурodзічаў з «чужых» сем'яў (паселішчаў). На думку спецыялістаў, агрэсіўныя паводзіны жывёл у дачыненні да людзей з'яўляюцца следствам ахоўнай рэакцыі ў выпадках, калі жывёлы расцэньваюць дзеянні чалавека як пагрозу. Акрамя таго, небяспеку можа ўяўляць жывёла, хворая на шаленства.

### Што рыбаку трэба ведаць пра забароны

**Акрамя агульнавядомых нераставых забарон, вызначаных Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, Мінпрыроды і райвыканкамы могуць устанаўліваць дадатковыя абмежаванні па лоўлі рыбы ў мэтах яе аховы. У цяперашні час дзейнічае некалькі такіх забарон — як часовых, так і пастаянных.**

Забаронена аматарскае рыбалоўства:

— па 1 ліпеня 2018 года на ўчастку ракі Нёман ад плаціны Гродзенскай гідраэлектрастанцыі на адлегласці 1000 метраў уніз па цячэнні ракі да месца ўпадзення безназоўнага ручая ў раку Нёман (пастанова Мінпрыроды ад 9.07.2014 №31);

— штогод з 15 кастрычніка па 15 красавіка ў раёне водазабора каўшовага тыпу адкрытага акцыянернага таварыства «Гродна Азот» каля вёскі Пагараны Гродзенскага раёна на ўчастку ракі Нёман працягласцю 50 метраў ад межаў тэрыторыі водапрыёмнага каўша водазабора ўверх і ўніз па цячэнні, а таксама на самім водапрыёмным каўшы (пастанова Мінпрыроды ад 9.07.2014 №31);

— штогод з 1 кастрычніка па 15 красавіка на ўчастку ракі Гарынь у Столінскім раёне ад рыбагадавальніка «Дуброва» да моста-пераправы Бярэжнае—Рубель працягласцю 7 кіламетраў ад пчальніка і сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Новая Прыпяць» да месца ўпадзення ў раку Прыпяць (пастанова Мінпрыроды ад 19.02.2013 №6);

— штогод з 15 лістапада па 20 снежня ва ўсіх рыбалоўных угоддзях Рэспублікі Беларусь забаронена лоўля рапушкі еўрапейскай (пастанова Мінпрыроды ад 2.12.2015 №42);

— штогод з 15 кастрычніка па 15 красавіка на ўчастку Аўгустоўскага канала на адлегласці 350 метраў ад месца яго ўпадзення ў раку Нёман да далёкага ад ракі Нёман краю бетоннага прычала для судоў «Дзмісевічы» (пастанова Мінпрыроды ад 1.04.2016 №10);

— штогод з 1 красавіка па 30 мая ў Гродзенскім раёне Гродзенскай вобласці:

канал Аўгустоўскі — ад шлюза каля вёскі Нямнова да месца яго ўпадзення ў раку Нёман; пойменныя вадаёмы ракі Нёман: Келбаская затока каля вёскі Келбасіі; Беражанская затока каля вёскі Бярэжаны; у Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці — пойменныя вадаёмы ракі Нёман: возера Стары Нёман-1 каля вёскі Харцыца, возера Вінабойскае і возера Новае каля вёскі Навінка, затока без назвы каля вёскі Дубна;

у Магілёве і Магілёўскім раёне Магілёўскай вобласці — на ўчастку ракі Днепр і прылеглых пойменных вадаёмах у межах ад водазабора філіяла адкрытага акцыянернага таварыства «БелАЗ» — кіруючай кампаніі холдынга «БелАЗ-Холдынг» у г. Магілёве — «Магілёўскі аўтамабільны завод імя С. М. Кірава» да вусця ракі Дзебра;

у Свіслацкім раёне Гродзенскай вобласці і Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці — на ўчастку ракі Нараў ад паўднёва-заходняга вугла квартала 176 да паўднёва-заходняга вугла квартала 206 Ашчэпскага лясніцтва дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» (пастанова Мінпрыроды ад 6.10.2016 №31);

— штогод з 20 сакавіка па 18 мая ў Лунінецкім раёне Брэсцкай вобласці:

канал Мікашэвіцкі — на працягу 2,5 кіламетра ўверх па канале ад месца ўпадзення канала ў раку Прыпяць; рака Прыпяць — на працягу 500 метраў уверх і ўніз па цячэнні ракі ад месца ўпадзення ў яе канала Мікашэвіцкі (пастанова Мінпрыроды ад 6.10.2016 №31);

— па 21 снежня 2017 года на возеры Дымаnoўскае (Даманаўскае) у Віцебскім раёне (рашэнне Віцебскага райвыканкама ад 7.12.2015 №1547);

— да 31 снежня 2017 года на сажалцы, размешчанай на рацэ Вядзьма ў межах Ляхавіч (рашэнне Ляхавіцкага райвыканкама ад 15.04.2015 №352).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*rs@zviazda.by*



## Рэпарцёр атрымаў заданне...

# ЗНАЙСЦІ РАБОТУ Ў ВЁСЦЫ,

## або Адзін дзень з жыцця прадуктовай крамы

**І ўчора, і сёння, і заўтра — кожны з нас у сваім штодзённым жыцці сустракаецца з прадаўцамі. І мае пра іх асабіста, пра іх работу ўласнае меркаванне, пачэрпнутае з вопыту сустрэч — больш-менш працяглай ці не вельмі. Адны з людзей па той бок прылаўка — прыязныя і ўсмешлівыя, іншыя ж, наадварот — маўклівыя і панурыя. Сёння і я пабуду ў ролі прадаўца, каб на сабе пастарацца зразумець, што ж адчуваюць яны падчас працы.**

...Вуліцы нашай сталіцы і іншых гарадоў сёння літаральна нашпігаваны рознымі гандлёвымі кропкамі — універсамамі, універмагамі, спецыялізаванымі крамамі, нявялікімі кіёскамі. Людзей там многа бывае, як і грошай, якія яны там пакідаюць. А што ж робяць і як жывуць прадаўцы ў правінцыі?

Я выбрала краму ў вёсцы В., якая знаходзіцца кіламетраў за сто ад Мінска, у Барысаўскім раёне. Гэта — маленькі прадуктовы павільёнчык у цэнтры сяла.

Перад пачаткам рабочага дня спытаю пакупнікоў аб тым, ці задавальняе іх абслугоўванне.

**Юлія Аверына:**

— Крама вельмі падабаецца. Штодзень прыходзім да Людмілы (так завуць гаспадыню крамы). Заўсёды ў яе тут усё свежанькае, усё акуратненька расстаўлена, вялікі выбар. Радуе тое, што ў адным месцы можна купіць самыя разнастайныя тавары — і прадуктовыя, і гаспадарчыя. Гэта вельмі зручна. З недахопаў — хіба што вялікія чэргі бываюць, а памяшканне тут маленькае.

**Дзяніс Іванчанка:**

— Што датычыцца асартыменту, то заўсёды ўсё ёсць, добры выбар. Прыемна і тое, што абслугоўвае заўсёды ветлівы і жыццярадасны прадавец, да якога хочацца вяртацца зноў.

...Хоць вёска і прачынаецца рана, крама пачынае сваю работу толькі а дзясятай гадзіне. Але яшчэ хвілін за дзесяць да адкрыцця першыя наведвальнікі ўжо перамінаюцца з нагі на нагу, чакаючы прадаўца.

Замок нарэшце звонка пстрыкнуў — дзверы адчыніліся. З памяшкання даносіцца прыемны водар свежага хлеба і булак.

Мая новая кіраўніца Людміла Сяргееўна правяла невялікі інструктаж і выдала мне новую ўніформу: шапачку, халат і поліэтыленавыя пальчаткі: і далёка ад сталіцы захоўваюцца ўсе санітарныя патрабаванні і нормы.

Уключаем касу, рабочы дзень пачынаецца.

Пакуль Людміла абслугоўвае пакупнікоў, пагляджу асартымент. Тут ёсць усё, што патрэбна для паўсядзённага жыцця, пачынаючы ад корму для хатніх жывёл і заканчваючы сродкамі асабістай гігіены. Такі маленькі міні-маркет на трыццаці квадратных метрах.

— У рабоце прадаўца галоўнае — гэта вялікае цярпенне і сапраўдная, непадробная ўсмешка. Ёсць людзі, якія, як мне здаецца, ужо загадзя скіраваныя на канфлікт. Толькі і чакаюць моманту, каб завесціся. Не варта звяртаць увагі на іх бурчанне, трэба выконваць сваю работу, — лічыць Людміла.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як толькі з'явілася вольная хвілінка, я хуценька ўзялася фасаваць печыва: стараешся ўсё паспець, каб людзям было прыемна рабіць пакупкі, каб усе заставаліся задаволенымі.

За акном паказалася машына, упрыгожаная шарыкамі і рознакаляровымі стужкамі. Мабыць, у людзей свята.

— Добры дзень! А вы жаніхам зніжкі робіце? — яшчэ стоячы каля дзвярэй пацікавіўся высокі статны мужчына гадоў шасцідзесяці.

— Для вас усё зробім, заходзьце! — з усмешкай адказвае Людміла.

Як мы зразумелі з размовы, людзі святкавалі гадавіну вяселля і вырашылі закупіць прадукты, каб справіць урачыстасць.

— Добра ў вас: усё ёсць, і прадаўцы прыветлівыя, і зніжкі жаніхам, — пачулі мы напаследак.

Удзячныя пакупнікі, якіх тут нямала, — гэта ўзнагарода за працу прадаўца.

Набліжаецца час абеду: пара б і паесці. А Людміла яшчэ завіхаецца за прылаўкам. Чарга выстраілася да дзвярэй.

— Я тут працую адна, таму не зачыняюся на абед. Перабіваюся невялічкімі перакусамі, пакуль няма пакупнікоў. Для здароўя гэта не вельмі, але іншага выхаду няма, — расказвае жанчына.

Дапіўшы сваю каву, я адчула прыліў сіл. Нібыта новае дыханне адкрылася. Цяпер, здаецца, набраўшыся крыху вопыту і смеласці, магу самастойна абслугоўваць пакупнікоў. Таму пад пільным назіраннем відэакамер і кіраўніцтвам гаспадыні іду да прылаўка.

— А карткай у вас можна разлічыцца? — цікавіцца жанчына пенсійнага ўзросту.

— Можна, — капіруючы усмешлівасць і добразычлівасць Людмілы, адказваю я.

— А малако свежае? А кефір? Хто вытворца? Калі вырабілі? Які тэрмін захоўвання? А вы такая маладая, не ашукаеце? — з недаверам пасыпаліся пытанні ў мой адрас.

Я не разгубілася. Ды і старэйшая памочніца, назіраючы за сітуацыяй збоку, вырашыла мне дапамагчы. І ўсё адразу стала на сваё месца.

— Пакупнікі ў мяне розныя: ёсць і капрызныя, якім трэба ўдзяляць шмат увагі; ёсць занятыя, якіх патрэбна найхутчэй адпусціць, асобная катэгорыя — дзеці. З імі нават размаўляць варта па-іншаму: слова ў слова тлумачыць і быць дасведчанай нават наконт навінак мультфільмаў. Стараешся ўсіх зразумець і нікога не пакрыўдзіць, — кажа Людміла Сяргееўна.

— Людачка, а можна мне без чаргі? Абед заканчваецца. Дай, калі ласка, даражэнькая, палову хлеба і малака, — папрасілі з натоўпу.

— Вось, я і кажу, да ўсіх трэба адносіцца з разуменнем, — адказвае Людміла.

Здаецца, сельская мясцовасць, а чэргі нібыта перад святам, хоць гэта не адзіная крама ў вёсцы.

— А былі ў вас якія-небудзь «незвычайныя» сітуацыі? — цікаўлюся я.

— Так, і іх дастаткова. З нядаўняга... Адна жанчына стаяла ў чарзе і знайшла на падлозе сорак рублёў, падабрала і аддала мне, сказала, што, можа, хто заўважыць згубленае і вернецца, але ніхто не прыходзіў ні на працягу дня, ні потым. А вечарам, праглядаючы камеры, убачыла, што гэта ў яе грошы з кашалька і выпалі, калі яна яго раскрывала. Пазваніла ёй і сказала, каб яна прыйшла і забрала прапажу.

Часта бываюць выпадкі, калі людзі проста бяруць прадукты ў доўг. Але гэта жыццё, стараешся зразумець і ўвайсці ў становішча кожнага. Мы ж аднавяскоўцы. А ў цэлым, усё ў нас добра.

Пад вечар ногі ўжо ватныя, радуе толькі тое, што час ляціць тут вельмі хутка. Я не заўважыла, як стрэлкі гадзінніка паказалі 20:00. А гэта значыць, што рабочы дзень завяршаецца. Толькі хто будзе рыхтаваць краму да закрыцця?

— Стаўкі прыбіральшчыцы ў нас няма, таму неабходна яшчэ і прыбраць рабочае месца: прадэзынфікаваць стальніцы, памыць падлогу, заставіць пустыя месцы на вітрынах, — падказвае напарніца.

Вось і змена закрыта. Чарговы рабочы дзень прадаўца скончыўся. А разам з ім і мой цікавы вопыт.

**Анастасія ГРУК**

## Падрабязнасці

### ПАКАРАННЕ ДЛЯ БАБУЛІ

**У Магілёве вынеслі прысуд жанчыне, якая выкінула з 5-га паверха сваю 9-месячную ўнучку.**

Звычайна да ўнукаў адносяцца больш пяшчотна, чым да ўласных дзяцей. Але гэты выпадак зусім нелагічны і наогул бесчалавечны. Нават з улікам таго, што жанчына падчас свайго апошняга слова ў судзе шчыра плакала і прасіла прабачэння. За яе перажывала ўся радня, якая прыйшла на пасяджэнне. На шчасце, унучка, якая трапіла пад гарачую руку бабулі пагода таму, жывая.

— У двухпакаёўцы разам з абвінавачанай пражываюць яшчэ дзве яе дачкі са сваімі сем'ямі, — расказвае падрабязнасці справы **дзяржаўны абвінаваўца, старшы пракурор аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Аляксандр РАМАНАЎ.** — 31 студзеня нікога дома не было, акрамя бабулі і яе 9-месячнай унучкі. Тое, што адбылося, жанчына не памятае.

Устаноўлена, што на момант здзяйснення злачынства жанчына выпіла 0,9 літра піва і паўлітровую бутэльку гарэлкі. Дзяўчынку пад вокнамі шматпавярховіка знайшлі выпадковыя прахожыя. Яны і выклікалі хуткую дапамогу. Малая ляжала на снезе ў адной кофтачцы і паўзунках. На яе валасах нават ужо з'явіліся ледзяшы. Што датычыцца бабулі, то родныя знайшлі яе дома, яна спала на падлозе.

Жанчына абвінавачваецца па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса РБ: 14-ы (частка 1, пункты 2 і 6) і 139-ы (частка 2). Апошні прадугледжвае пакаранне ад 8 гадоў да вышэйшай меры. Дзяржабвінаваўца запытаў для падсуднай 13 гадоў калоніі агульнага рэжыму, суд вырашыў абмежавацца 11 гадамі. У абвінавачанай яшчэ ёсць час аспрэчыць гэта рашэнне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### «НАРЫХТОЎВАЛІ» БЯРОЗАВІК

**Менавіта такі малюнак змаглі назіраць работнікі Маладзечанскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету на тэрыторыі Першамайскага лясніцтва Валожынскага лясгаса.**

Па лясным квартале плошчай 2,5 гектара былі раскладзены велізарныя поліэтыленавыя мяхі, а з бяроз тырчалі жалезныя жалабы. «Падсочанымі» былі 38 дрэў. А між тым сезон нарыхтоўкі бярозавіку даўно скончыўся. Чаму дрэвы дагэтуль не апрацаваныя, а ў лесе знаходзіцца па сутнасці смецце, ляснічы растлумачыць не змог. Парадак нарыхтоўкі соку прадугледжвае пасля заканчэння гэтага працэсу зрэзы на дрэвах замазваць варам ці глінай для папярэджання захворванняў. За парушэнне гэтага парадку ляснічы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, несці адказ давядзецца і юрыдычнай асобе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»**

**(организатор аукциона) по поручению Белорусско-нидерландского совместного предприятия «АМИПАК» – ОАО (продавец) извещает о проведении 22 августа 2017 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 часов в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов |
| --- | --- |
| | **Капитальное строение с инв. №321/С-11959, общей площадью 1328,2 кв. м,** назначение – здание специализированное животноводства, наименование – **одноэтажное кирпичное здание коровника.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с,1/2. **Капитальное строение с инв. №321/С-11960, общей площадью 1432,4 кв. м,** назначение – здание специализированное животноводства, наименование – **одноэтажное кирпичное здание коровника на 250 голов.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с,1/3. **Капитальное строение с инв. №321/С-11961, общей площадью 291 кв. м,** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **одноэтажное кирпичное здание магазина.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с,1. **Капитальное строение с инв. №321/С-11962, общей площадью 1087 кв. м,** назначение – здание специализированное животноводства, наименование – **одноэтажное кирпичное здание коровника на 200 голов.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с,1/5. **Капитальное строение с инв. №321/С-11963, общей площадью 1442 кв. м,** назначение – здание специализированное животноводства, наименование – **одноэтажное бетонное здание коровника на 200 голов.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с,1/4. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320500000001000472 площадью 5,0427 га** – для обслуживания объектов специализированных животноводства (трех коровников, коровника-телятника), объекта розничной торговли (магазина) **(право аренды).** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, вблизи п. Светлый |
| 1 | **Капитальное строение с инв. №321/С-12607, общей площадью 689,1 кв. м,** назначение – здание специализированное растениеводства, наименование – **здание специализированное растениеводства.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 9/2. **Капитальное строение с инв. №321/С-12608, общей площадью 298,8 кв. м,** назначение – здание специализированное растениеводства, наименование – **здание специализированное растениеводства.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с,д. Недойка, ул. Советская, 9/3. **Капитальное строение с инв. №321/С-12609, общей площадью 619,4 кв. м,** назначение – здание специализированное растениеводства, наименование – **здание специализированное растениеводства.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 9/4. **Капитальное строение с инв. №321/С-12610, общей площадью 37,8 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **здание специализированное иного назначения.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 9/5. **Капитальное строение с инв. №321/С-12611, общей площадью 872,3 кв. м,** назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – **здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции).** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 9/6. **Капитальное строение с инв. №321/С-12744, общей площадью 610,9 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **здание зерносклада №4.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 9. **Капитальное строение с инв. №321/С-12745, общей площадью 578,8 кв. м,** назначение – здание нежилое, наименование – **здание зерносклада №3.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 9/1. **Капитальное строение с инв. № 321/С-12859, общей площадью 223,7 кв. м,** назначение – сооружение специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – **навес для сушки.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, территория мехдвора СП «АМИПАК» ОАО. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320582003901000071 площадью 5,4622 га** – для обслуживания зданий и сооружений зерносушильного комплекса, механической мастерской, складов и объектов иного назначения **(право аренды).** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, д. 9. |
| | **Капитальное строение с инв. № 321/С-12617, общей площадью 79,5 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное.** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 31/Б. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320582003901000069 площадью 0,0374 га** – для обслуживания административного здания **(право аренды).** Местонахождение: Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, д. Недойка, ул. Советская, 31Б. |
| | Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС (20%) – **253 000,00** бел. руб. |
| | Сумма задатка, с учетом НДС (20%) – **2 530,00** бел. руб. |

**Продавец:** СП «АМИПАК» – ОАО, г. Буда-Кошелево, ул. Ленина, 61/а. Конт. тел.: 8(044) 780-72-65, 8(02336)7-39-92 – Кузьменко Олег Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5%. Для участия в аукционе необходимо: 1).** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (СП «АМИПАК» – ОАО):** р/с BY39BAPB30122412000130000000 в РКЦ №15 г. Буда-Кошелево ГОУ ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY23912, УНП 400054120, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах.

**2).** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 августа 2017 г**. по адресу: ул. Гагарина, 20, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18 августа 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 29.06.2017 г. №73 (20905). Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 23-23-53, на сайте gomeloblreklama.by.**

■ Напярэдадні

# ТРЭБА ЎСПОМНІЦЬ УСІХ

**...Так здарылася, што з дзяцінства маімі любімымі выданнямі былі «Піянер Беларусі», «Чырвоная змена» і «Звязда». У нас з ёй даўняя дружба.**

У перыяд сваёй працы ў Вярхоўным Савеце, а затым у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу я шмат супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты, часта публікаваў матэрыялы на самыя актуальныя тэмы і (у адрозненне ад іншых чытачоў) меў шчасце асабіста ведаць многіх супрацоўнікаў.

Тут і зараз я хацеў бы ўспомніць найперш Аркадзя Апанасавіча Тоўсціка, чалавека, які знаходзіў час на ўсё: і на тое, каб рэдагаваць газету, і на тое, каб, будучы дэпутатам Вярхоўнага Савета, дапамагаць сваім выбаршчыкам, каб вельмі плённа ўзначальваць камісію па культуры, кантактаваць з самымі рознымі людзьмі...

Уражвала сваім камсамольскім запалам (яна прыйшла з «Чырвонай змены»), сваім талентам і намесніца галоўнага рэдактара Раіса Фёдараўна Самусенкава. Яна шмат ездзіла па краіне, шмат пісала — і праблемных артыкулаў і нарысаў пра знакамітых людзей. Ды што там... Некалі раней у газетах абавязкова змяшчаліся так званыя перадавіцы. Іх мала хто чытаў, але ж, калі ўнізе было прозвішча Раісы Фёдараўны, чыталіся нават яны, бо прымушалі чытачоў думаць.

Вельмі цікавым і чалавекам, і журналістам быў Іван Кандратавіч Казлоў. Яго канькам былі фельетоны і тэкстоўкі да здымкаў — часцяком вершаваныя, з гумарам...

І гарбату ён заварваў адмысловую — з 12 траў. Тады, дарэчы, лічылася, што ты не быў у рэдакцыі «Звязды», калі не піў Янкавай гарбаты.

Добра ведаў я і нястомнага змагара за беларушчыну Уладзіміра Браніслававіча Наркевіча, які рэдагаваў газету ў найскладанейшы час, можна сказаць, на стыку стагоддзяў. Толькі адзін прыклад: артыкул 7 Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» гаварыў, што акты дзяржорганаў краіны прымаюцца і публікуюцца на беларускай і (або) рускай мовах. Такая фармулёўка давала магчымасць друкаваць іх толькі на адной мове (пераважна — рускай), што парушала канстытуцыйны прынцып роўнасці моў.

Помню, як напісаў аб гэтым артыкул, як «Звязда» надрукавала яго разам са сваім каментарыем. У выніку ў Закон былі ўнесены змяненні...

Я згадаў толькі гэтыя прозвішчы. Іншыя чытачы, ну вядома ж, успомняць іншыя, бо калі, як не зараз, перад стагоддзем «Звязды»?

**Леанід Якаўлевіч СЯНЮТА**, *г. Мінск*

■ Бацькі і дзеці

# Такое не забываецца...

**Юбілей «Звязды» асабіста для мяне — унікальнае свята! Гонар маю да яго прычыніцца.**

Справа ў тым, што неяк позняй ноччу я, тады ўласны карэспандэнт «Звязды» па Брэсцкай вобласці, трапіў у бацькоўскую хату лётчыка-касманаўта СССР Пятра Клімука, пазнаёміўся з яго маці Марфай Паўлаўнай, айчымам Міхаілам Марозавым, узяў інтэрв'ю з нагоды старту касмічнага карабля «Саюз-6».

Матэрыял для газеты напісаў яшчэ да світання і па тэлефоне перадаў у рэдакцыю...



Потым «Звязда» друкавала на сваіх старонках не толькі замалёўкі ды нарысы на касмічную тэму, але і асобныя ўрыўкі з маёй дакументальнай аповесці «Арыенцір — сузор'е Арыён», якая 20-тысячным тыражом выйшла ў выдавецтве «Беларусь», а пасля другога палёту Пятра Клімука з Віталем Севасцьянавым была перакладзена на рускую мову і стала распаўсюджвацца не толькі ў нашай краіне, але і далёка за межамі.

Цель проекта – строительство жилого дома в составе объекта «Строительство двух многоквартирных жилых домов по генплану №32 и №33 в составе третьего пускового комплекса микрорайона №1 жилого района «Копище». Жилой дом №32 по генплану» в Минском районе. По объекту получено положительное экспертное заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 30.03.2017 г. №100-70/17. Права застройщика на земельный участок подтверждает свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 20 апреля 2016 г. № 600/1344-5252. Площадь земельного участка – 0,7825 га. Проектная документация для строительства жилого дома разработана на основе номенклатуры конструкций и изделий индустриального домостроения типового проекта Б.111-Моз90-1.13.

**Характеристика жилого дома:**

Проектом предусматривается строительство 132-квартирного 19-этажного жилого дома с техническим подпольем и чердаком. Жилой дом расположен вдоль ул. Подгорная. Заезд к жилому дому осуществляется с ул. Лопатина. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема здания – перекрестно-стеновая с поэтажно опертыми несущими внутренними и наружными стенами, перекрытиями с опиранием по контуру и по трем сторонам. Фундаменты свайные с монолитным железобетонным ленточным ростверком. Наружные и внутренние стены техподполья – монолитные железобетонные. Наружные стены жилой части – трехслойные железобетонные панели. Внутренние несущие стены – однослойные железобетонные. Перекрытия и покрытие выполнены из сборных железобетонных панелей. Лестницы – из сборных железобетонных маршей и площадок. Кровля – малоуклонная с покрытием из двух слоев кровельного материала. Здание оборудовано грузопассажирским лифтом грузоподъемностью 1000 кг и пассажирским лифтом грузоподъемностью 450 кг. Внутренняя отделка мест общего пользования предусмотрена с окраской стен, устройством плиточных полов и подвесных потолков.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учетов тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы алюминиевые, конвекторы стальные. Вентиляция жилых помещений естественная. Вентиляция помещений кухонь, ванных и санузлов осуществляется через вентканалы. Здание оборудовано раздельными системами хоз-питьевого (горячего и холодного) водоснабжения и противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрены система дымоудаления из внеквартирных коридоров и лифтовых холлов, система подпора воздуха в шахты лифтов. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной разводки электропроводки. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры в этажных щитах. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд, закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Технико-экономические показатели жилого дома: количество жилых этажей – 19; количество секций – 1; количество квартир – 132, в том числе: однокомнатных – 57 (общей площадью от 47,0 до 50,99 кв. метров), двухкомнатных – 57 (общей площадью от 61,89 до 63,73 кв. метров), трехкомнатных – 18 (общей площадью 80,74 и 80,92 кв. метров). Общая площадь квартир – 7778,54 кв. метров.

**Строительная готовность жилых помещений:**

- без выполнения подготовительных работ под отделку стен, полов и потолков, без выполнения работ по внутренней отделке (без штукатурки стен, без стяжки, без оклейки обоями, окраски, облицовки);
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна, вытяжка через каналы вентблоков;
- электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой розеток, выключателей, светильника в ванной комнате, звонка, электросчетчика (без установки электроплиты);
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель;
- канализация – стояк, установка и подключение унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на лоджии – из ПВХ-профиля со стеклопакетом;
- остекление лоджий – из ПВХ-профиля со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная деревянная;
- радиоприемник;
- пожарный шланг;
- автономный пожарный извещатель.

**Сведения о ценах на объекты долевого строительства (квартиры) (на дату опубликования проектной декларации) и их количестве, предлагаемых для заключения договоров в многоквартирном жилом доме № 32 по генплану на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика), и условия их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке:**

| Тип квартиры | Общая площадь квартиры по проекту, кв. метров | Количество квартир, шт. | Стоимость 1 кв. м, долл. США* |
|---|---|---|---|
| однокомнатные | 47,0 – 50,99 | 57 | 1000 |
| двухкомнатные | 61,89 – 63,73 | 57 | 950 |
| трехкомнатные | 80,74 – 80,92 | 18 | 900 |
| **Итого для заключения договоров создания объекта долевого строительства предлагаются** | | **132 квартиры** | |

*расчеты производятся в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

**Застройщиком предусмотрена система скидок согласно утвержденному Положению о порядке предоставления скидок в зависимости от этажа и условий оплаты объекта долевого строительства.**

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ООО «СИ-трейдинг» вправе заключить договор с другим претендентом.

Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства:

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства.

2. Первоначальный взнос для участников долевого строительства составляет не менее 30% от стоимости квартиры (цены договора) и должен быть внесен в течение 3 рабочих дней со дня регистрации договора (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть оплачивается по графику платежей (приложение к договору создания объекта долевого строительства).

**Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** офисное помещение без приема посетителей на 1-м этаже.

**Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме и иных объектах недвижимости, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода в эксплуатацию указанных объектов недвижимости и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома, иные объекты недвижимости, предназначены для его эксплуатации, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось всеми дольщиками, и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано, - лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома:** июль 2018 года.

**Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком:** договор строительного подряда № 12/06/2017 от 12.06.2017 г., заключенный застройщиком с Унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

**Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству:** по согласованию с застройщиком в установленном им время и в присутствии его уполномоченных представителей с соблюдением требований техники безопасности.

Срок действия декларации – до опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие либо изменяет опубликованной ранее.

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенного по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-46(45), +375 (29) 606-29-96 или на сайте sit.by.

■ Меркаванне

# ВАРОТЫ МІРУ І БЯСПЕКІ

## Пагаршэнне расійска-амерыканскіх адносін не паўплывае на супрацоўніцтва Беларусі і ЗША



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Такое меркаванне выказаў ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у амерыканскім штаце Фларыда, палітолаг і пісьменнік Майкл МАРГУЛІС. Нагадаем, што нядаўна Расія ўвяла контрсанкцыі ў адносінах да ЗША, пазбавіўшы амерыканцаў пасольскай дачы і скараціўшы частку дыпламатаў, а Дональд Трамп падпісаў закон аб санкцыях супраць Расіі.**

— У мяне парадаксальнае пачуццё, што непаразуменні паміж Расіяй і ЗША канчаюцца. Трамп не можа сказаць пра Расію, як сказаў калісьці прэзідэнт Рэйган пра СССР, што гэта «імперыя зла», бо цяпер гэта не адпавядае рэальнасці, — лічыць Майкл Маргуліс. — Таму, калі пункты кіпення ўжо дасягнулі краёў палітычнай каструлі інтарэсаў, я думаю, што пачнецца новы віток прыміральных адносін паміж ЗША і Расіяй. І ў сувязі з гэтым Беларусь уздыхне вальней. Бо для Беларусі, якая шукае выгадных дзелавых і палітычных кантактаў з усімі краінамі, найбольш спрыяльная абстаноўка — гэта мір і спакой.

На спецыяльнай прэс-канферэнцыі, прысвечанай перспектывам развіцця адносін Беларусі і ЗША ў сувязі з работай новай Адміністрацыі прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі, Майкл Маргуліс выказаў думку, што беларуска-амерыканскія адносіны палепшацца менавіта дзякуючы прыходу Дональда Трампа. «У яго мысленне не палітыка, які прывык усё прыкрываць прыгожымі словамі аб роўнасці, любві і справядлівасці. Ён — чалавек-практык. У яго ментальнасць бізнесмена, якая многім не падабаецца. Аднак я гэтаму рады, паколькі ён практычна глядзіць на рэчы», — сказаў пісьменнік.

Цяпер разглядаецца пытанне аб прызначэнні амерыканскага пасла ў Беларусь, нагадаў Майкл Маргуліс. «Акрамя таго, абмяркоўваецца рэзкае павелічэнне колькасці людзей у пасольстве ЗША ў вашай краіне, — дадаў ганаровы консул. — У сувязі з тым, што Адміністрацыя прэзідэнта цяпер новая, гэта пытанне адназначна будзе вырашана. Лічу, што гэта няправільна, што беларускія грамадзяне для адкрыцця візы павінны ехаць у Маскву, Кіеў ці іншыя гарады».

Па словах ганаровага консула, супрацоўніцтва Беларусі і Злучаных Штатаў Амерыкі патрэбна не толькі беларускаму боку, але і амерыканцам. Менавіта Беларусь можа стаць для ЗША верным партнёрам, які гатовы выконваць свае абавязацельствы, упэўнены палітолаг. «Ваша краіна і цяпер многімі сваімі праектамі паказвае адданасць дагаворам і кантрактам», — дадаў ганаровы консул.

Як сёння выглядае Беларусь у вачах амерыканскіх грамадзян? На думку Майкла Маргуліса, у апошні час сітуацыя змянілася ў сувязі з выхадам часопіса «US-Belarus Observer», да выдання якога ён мае прамое дачыненне. «Раней у Кангрэсе мне задавалі такія пытанні: Майкл, а дзе Беларусь? На тэрыторыі Польшчы ці Расіі? — успамінае ганаровы консул. — Цяпер пра такое ўжо не пытаюць. Гэты часопіс расказвае пра жыццё ў краіне, паказвае Беларусь як цудоўную краіну з добрымі людзьмі, якія шмат перажылі, але, тым не менш, жадаюць міру і дабра іншым людзям».

У апошні час Беларусь усё часцей называюць донарам стабільнасці паміж Усходам і Захадам, паміж Еўропай і Расіяй, аднак Майкл Маргуліс пакуль не гатовы так называць Беларусь у дачыненні да Злучаных Штатаў Амерыкі. Паводле яго слоў, амерыканская ментальнасць сур'ёзна адрозніваецца ад еўрапейскай, а еўрапейцам Беларусь усё ж бліжэйшая — і ў геаграфічным плане ў тым ліку.

— Я назваў бы Беларусь варотамі паміж Усходам і Захадам і лічу, што ў геапалітычным сэнсе Беларусь вельмі важная не толькі для Еўропы, але і для ЗША, — сказаў ганаровы консул. — Усё ў жыцці пазнаецца ў параўнанні: калі на тэрыторыі суседніх для Беларусі дзяржаў адбываюцца крывавыя сутыкненні, то раптам па-асабліваму ацэньваеш мір у краіне. Нядаўна ехаў па Мінску і бачу: ідзе малады бацька, трымае на руках маленькую дзяўчынку, а яна гладзіць яго валасы. Такія цудоўныя і простыя рэчы вельмі лёгка страціць. Мір ствараецца вельмі доўга, а руйнуецца імгненна.

Майкл Маргуліс з'яўляецца кіраўніком фонду «Духоўная дыпламатыя», які спрабуе спыніць розныя сусветныя канфлікты мірнымі спосабамі, а менавіта — праз духоўныя каштоўнасці. У апошні час палітолаг часта бывае ў Данецку з місіяй свайго фонду. «Паверце, калі ты трымаеш на руках хлопчыка-інваліда, які страціў канечнасць праз выбух, то ўсе твае праблемы адыходзяць на другі план», — сказаў Майкл Маргуліс.

На думку палітолага, Мінскія пагадненні выконваюцца вельмі цяжка — усімі бакамі, уцягнутымі ў канфлікт. Фонд «Духоўная дыпламатыя» прыкладае разнастайныя намаганні, каб дамоўленасці не заставаліся пустой формай, а працягвалі працаваць. Згодна з прагнозам Майкла Маргуліса, гэты канфлікт не будзе вырашаны без умяшання Злучаных Штатаў Амерыкі. Ідэальны сцэнарый развіцця падзей ганаровы консул бачыць такім: прэзідэнты Расіі, ЗША, Украіны і Беларусі збяруцца і вырашаць гэтае надзвычай цяжкае пытанне.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ К@нтыненты

# НА ВЕРШАЛІНЕ АФРЫКІ

## Чаму ліхаманіць каралеўства Марока?



**Кароль Марока Мухамед VI памілаваў амаль 1200 чалавек, змешчаных пад арышт за ўдзел у пратэстах на поўначы краіны. Падчас выступленняў у гэтай афрыканскай краіне каля 80 паліцэйскіх атрымалі раненні. Як адзначаецца ў заяве міністэрства юстыцыі, частка памілаваных удзельнічала ў дэманстрацыях у партовым горадзе Эль-Хасейма і яго акругах. Прабачэнне караля атрымалі тыя, «хто не здзяйсняў злачынстваў і не быў замяшаны ў сур'ёзных інцыдэнтах». Чаму ліхаманіць каралеўства, якое дагэтуль было сімвалам стабільнасці на «чорным кантыненце»?**

### Смачны кавалак

Марока знаходзіцца зусім непадалёк ад Старога Свету — Гібралтарскі праліў аддзяляе гэтую афрыканскую краіну ад Еўропы ўсяго на 16 кіламетраў. Кажуць, што стоячы на ўзбярэжжы каралеўства, можна назіраць за рухам машын у Іспаніі. А два іспанскія анклавы — Сеута і Мелілья — размясціліся на тэрыторыі самога каралеўства. Марока — адна з найстаражытнейшых дзяржаў «чорнага кантынента». Менавіта тут, у раёне Касабланкі, выяўлены першыя сляды знаходжання чалавека ў Паўночнай Афрыцы.

Гэтыя мясціны насамрэч стратэгічныя, таму спрадвек прыцягвалі заваёўнікаў. На міжземнаморскім узбярэжжы Марока заснавалі свае гандлёвыя калоніі спачатку фінікійцы, затым тут атабарыліся карфагеняне. З ІІ стагоддзя да н. э., пасля заваявання Карфагена рымлянамі, пачалося рымскае валадарства ў Паўночнай Афрыцы. У 429 годзе тэрыторыю сучаснага Марока (рымскую правінцыю Маўрытанія Тынгітана) захапілі вандалы, але праз сто гадоў яе вярнулі ў склад імперыі візантыйцы. У 682 годзе пачалося арабскае заваяванне Паўночнай Афрыкі. Першую арабскую дзяржаву на тэрыторыі Марока заснаваў у 784 годзе ўцякач з Аравіі імам Ідрыс ібн Абдалах. Найбольшага росквіту яна дасягнула пры дынастыях Альмаравідаў і Альмахадаў у XI—XII стагоддзях.

У XVII—XIX стагоддзях гэтая тэрыторыя лічылася пірацкай дзяржавай, паколькі ў многіх гарадах фактычная ўлада знаходзілася ў руках карсараў. Аднак гэта не перашкаджала ажыццяўляць дыпламатычныя функцыі, у 1777 годзе Марока аказалася першай дзяржавай у свеце, якая прызнала незалежнасць ЗША. У 1859—1860 гадах Іспанія заняла частку земляў султаната. У канцы XIX стагоддзя Марока стала аб'ектам саперніцтва Іспаніі, Францыі, Англіі, а ў ХХ стагоддзі — таксама і Германіі. У выніку мараканскіх крызісаў 1906—1911 гадоў Францыя здабыла большую частку гэтай тэрыторыі.

Пасля трохгадовага перыяду масавых выступленняў, якія ў шэрагу мясцовасцяў краіны перайшлі ў антыфранцузскае паўстанне, і палітычнага крызісу, выкліканага спробамі змены караля, у сакавіку 1956 года Францыя прызнала незалежнасць Марока, а ў красавіку незалежнасць атрымала і Іспанскае Марока, хоць некалькі гарадоў засталося за іспанцамі. Цяпер гэтая краіна (дарэчы, трэцяя ў свеце па колькасці насельніцтва арабскамоўная дзяржава пасля Егіпта і Судана) лічыцца традыцыйным саюзнікам ЗША і Францыі ў макрарэгіёне.

### Па слядах меч-рыбы

У 2011-м полымя рэвалюцыі, загарэўшыся ў Тунісе, хутка перакінулася на суседнія краіны. Аднак Марока, у адрозненне ад, напрыклад, Егіпта, «арабскую вясну» перажыло адносна спакойна, паколькі кароль Махамед VI праявіў сябе кіраўніком больш мудрым, чым іншыя лідары рэгіёна, заўважае lenta.ru. Адразу пасля пачатку масавых хваляванняў манарх выступіў з адмысловым зваротам да падданых. Ён паабяцаў працягнуць структурныя рэформы, пачатыя яго бацькам Хасанам ІІ, падкрэсліўшы, што галоўная мэта яго праўлення — забяспечыць годнае жыццё ўсім мараканцам, асабліва маламаёмным. Словы былі тут жа падмацаваныя справамі: на прадуктовыя датацыі накіравалі больш за 20 мільярдаў долараў, што дазволіла ўтрымаць цэны на асноўныя прадукты харчавання — малако, хлеб, алей і цукар. Акрамя таго, улады пайшлі на павышэнне заробкаў дзяржслужачым — галоўным чынам дробным чыноўнікам, многія з якіх былі актыўнымі ўдзельнікамі пратэстаў. У выніку колькасць незадаволеных моцна скарацілася.

Неўзабаве кароль абвясціў і аб палітычных пераўтварэннях. Летам таго ж года ў краіне быў праведзены рэферэндум аб унясенні змяненняў у канстытуцыю. Папраўкі ў асноўны закон краіны падтрымалі практычна ўсе мараканцы. У прыватнасці, з тых часоў прэм'ер-міністр вылучаецца партыяй, якая перамагла на парламенцкіх выбарах. Прэм'ер атрымаў права распускаць парламент і прызначаць міністраў. Але манарх застаўся галоўнакамандуючым узброенымі сіламі, а таксама быў афіцыйна абвешчаны «вышэйшым рэлігійным аўтарытэтам» краіны. Акрамя таго, кароль захаваў за сабой кантроль над спецслужбамі і права прызначаць кіраўнікоў рэгіёнаў.



Увогуле, напал у мараканскім грамадстве ўдалося пагасіць, але, як высветлілася, толькі на час. Рэформы аказаліся чыста касметычнымі. Грошай у казне на харчовыя датацыі і павышэнне заробкаў чыноўнікаў не хапала, а парыцкрыць дэфіцыт з іншых крыніц не ўдавалася. Уся ўлада па-ранейшаму была засяроджана ў руках караля, які кантраляваў рэгіёны пры дапамозе лаяльных палітычных партый. Многія падданыя адчулі сябе падманутымі. Асаблівае напружанне ўзнікла ў дэпрэсіўным паўночным рэгіёне Марока Аль-Хасейме. Новую хвалю пратэстаў запусціла трагічная смерць гандляра рыбай Мухрына Фікры 28 кастрычніка мінулага года. Паліцэйскія канфіскавалі яго тавар (гэта была меч-рыба, лоўля якой у той перыяд была забаронена) і выкінулі рыбу ў кантэйнер смецявоза. Гаспадар у адчаі кінуўся ратаваць сваё дабро, залез у кузаў і быў раздушаны механізмам, які прасаваў адходы. Адзін з відавочцаў зняў гэта на мабільны тэлефон і выклаў відэа ў інтэрнэт. Грамадскаму абурэнню не было мяжы. На пахаванне гандляра прыйшлі тысячы чалавек. Увечары ў Аль-Хасейме і шэрагу іншых гарадоў, уключаючы сталіцу краіны Рабат, адбыліся масавыя мітынгі пратэсту.

### Усё могуць каралі?

З таго часу Марока рэгулярна скалануюць маніфестацыі. Грамадзяне патрабуюць ад уладаў сацыяльна-эканамічных рэформаў, актывізацыі барацьбы з карупцыяй. Цэнтрам пратэстнай актыўнасці стала гістарычная мясцовасць Рыф (правінцыя Аль-Хасейма) на поўначы каралеўства. Улады з апазіцыянерамі не цырымоняцца. Адзін з мітынгаў і ўвогуле скончыўся пабоішчам — 72 паліцэйскія і 11 дэманстрантаў атрымалі раненні. Такога напалу краіна не бачыла з 2011-га, калі ў Паўночнай Афрыцы бушавала «арабская вясна».

Адносіны паміж цэнтральнымі ўладамі краіны і насельніцтвам Рыфа заўсёды былі складанымі. Мясцовыя жыхары лічаць сябе калі і не асобнай народнасцю, то нейкай еднасцю, «рыфанцамі». Яны ваявалі супраць іспанскіх каланізатараў у пачатку ХХ стагоддзя, праводзілі акцыі пратэсту супраць уладаў у 1950-я і 1980-я, выхадцы з Рыфа былі галоўнымі актывістамі ў хваляваннях 2011 года. Падчас цяперашніх падзей разрозненыя групы пратэстуючых аб'ядналіся ў арганізацыю Hirak («Рух»), а ўзначаліў яе Насэр Зефзафі, чые продкі і сваякі таксама былі заўважнымі грамадскімі актывістамі.

Як ён заявіў, Hirak у Рыфе выказвае пратэст усяго мараканскага народа супраць знявагі, маргіналізацыі і галечы. Дасталося ад апазіцыянера і каралю. «Манарх не святы. Мы паважаем яго, але можам і абавязаны крытыкаваць яго», — сказаў лідар пратэстнага руху. 29 мая Зефзафі быў затрыманы паліцэйскімі пасля таго, як увarваўся ў мячэць падчас пятнічнай малітвы і перапыніў прамову імама, які заклікаў да супрацоўніцтва з урадам і каралём. Яму былі прад'яўлены абвінавачванні ў спробе перашкодзіць правядзенню рэлігійнага абраду, а таксама ў падрыве дзяржаўнай бяспекі і дзяржздрадзе. Разам з Зефзафі пад варту былі ўзяты некалькі дзясяткаў актывістаў. Тыя апазіцыянеры, што засталіся на волі, тут жа заклікалі прыхільнікаў зноў выйсці на вуліцы. У Рыфе і іншых рэгіёнах прайшлі масавыя маніфестацыі з патрабаваннямі вызваліць Зефзафі і іншых палітычных вязняў.

Становішча напалілася да такой ступені, што Аль-Хасейма была блакіравана сіламі праваапарадку, сутычкі з актывістамі і мітынгоўцамі адбываліся практычна штодня, і супрацьстаянне пагражала перарасці ў сур'ёзныя сутыкненні. Аднак у пачатку ліпеня стала вядома, што ўлады вырашылі вывесці з горада большую частку паліцэйскіх, як адзначалася ў афіцыйным паведамленні, для «забеспячэння права падданых на свабоднае выказванне меркавання і забеспячэнне іншых свабодаў». Па чутках, так распарадзіўся асабіста Махамед VI, які дагэтуль публічна не ўмешваўся. Жарсці трохі ўлегліся, хоць асобныя маніфестацыі і выступленні працягваліся.

Нягледзячы на востры характар барацьбы, апазіцыя і Hirak ні разу не выступілі адкрыта супраць караля. Нягледзячы на крызіс, манарх захоўвае аўтарытэт у Рыфе, жыхары якога дамагаюцца, каб ён непасрэдна ўмяшаўся ў сітуацыю, а не дзейнічаў праз міністраў і іншых чыноўнікаў. Гэта значыць выступіў у ролі суддзі.

30 ліпеня ў Марока адзначалася адно з галоўных дзяржаўных свят — Дзень трона, якое заснавана ў 1999 годзе ў гонар уступлення на прастол цяперашняга манарха. Па традыцыі кіраўнік дзяржавы звяртаецца да падданых са штогадовым пасланнем. Многія спадзяваліся, што кароль праявіць паблажлівасць і памілуе асуджаных актывістаў. Што, дарэчы, і адбылося. І Марока, здаецца, урэшце адыходзіць ад небяспечнай мяжы. Відавочна, што новага вітка супрацьстаяння не хоча ніхто.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

■ Мінскія хронікі

# ГЕРОЙ ДАСТАЕЎСКАГА І АЎТАР МЕДЫЦЫНСКАГА АДКРЫЦЦЯ

## Хто яны — беларускія немцы?



Вядомы доктар і дабрачынец Вільгельм Данілавіч Гіндэнбург.

**Сёлета мы адзначаем важную падзею — 500 гадоў беларускага кнігадрукавання. Настолькі ж маштабнае свята з аналагічнай датай і ў прыхільнікаў лютэранскай царквы, якая зарадзілася ў Германіі — 500 гадоў з пачатку рэфармісцкай дзейнасці Марціна Лютэра. І гэта супадзенне — далёка не адзінае, што цесна звязвае два народы...**

### На вуліцах Нямецкай і Лютэранскай...

Масавыя перасяленні немцаў у Расійскую Імперыю пачаліся ў часы праўлення Кацярыны ІІ. На засвоенай тэрыторыі яны займаліся земляробствам, рамёствамі, нярэдка станавіліся спецыялістамі, высакакласнымі ўрачамі. Да знакавых падзей ХХ стагоддзя, якія перавярнулі ход гісторыі, нямецкае насельніцтва Беларусі дасягала 70 тысяч, зараз жа ў краіне пражывае каля дзвюх тысяч чалавек гэтай нацыянальнасці.

У Мінску Нямецкая слабада (праўда, такая назва ў афіцыйных дакументах не выкарыстоўвалася) складалася з трох вуліц: Лютэранскай, Малой Лютэранскай і Нямецкай, якія цяпер носяць назвы Волаха, Клары Цэткін і Розы Люксембург адпаведна. Пра гістарычнае мінулае раёна нагадвае толькі невялікі сквер, які атрымаў назву Лютэранскі. Дарэчы, летась ён стаў вядомы на ўсю краіну, калі побач падчас будаўніцтва дарогі пачалі знаходзіць парэшткі з закрытых у 1960-х, а потым зруйнаваных лютэранскіх могілак.

Было некалькі хваляў перасялення немцаў на гістарычную радзіму: у перыяд Першай сусветнай вайны, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і перад Вялікай Айчыннай вайной, праўда, апошняя кранула пераважна прыбалтаў і жыхароў Паволжа, дзе імі была створана аўтаномная рэспубліка. Дарэчы, пасля рэвалюцыі эмігрантаў актыўна запрашалі назад, і частка з іх, асабліва інтэрнацыянальныя сям'і, вярталіся. Пасля Другой сусветнай вайны такога не было, негалосная забарона на вяртанне была знята толькі бліжэй да 1960-х.

У супольнасці нацыянальныя меншасці пачалі аб'ядноўвацца пасля распаду Савецкага Саюза. Як расказвае **заснавальніца грамадскага аб'яднання нямецкай культуры «Масты» і лютэранскай абшчыны «Выратаванне» Вольга ШТОКМАН,** 90-я гады былі часам плённай працы. Апроч сталіцы, нямецкія арганізацыі з'явіліся ў Віцебску, Гродне, Бабруйску, Гомелі, праўда з-за адсутнасці матэрыяльнай падтрымкі неўзабаве спынілі сваё існаванне. Затое цяпер Гродна стаў цэнтрам жыцця лютэранскай абшчыны, бо тут знаходзіцца адзіная ў Беларусі дзеючая кірха.

У мінулым жа толькі ў сталіцы было дзве лютэранскія царквы. Адна імя Святога Мікалая ў Нямецкай Слабадзе і другая, між іншым, на галоўнай вуліцы горада — Захар'еўскай, там дзе цяпер знаходзяцца задворкі культавага ўніверсама «Цэнтральны». Яна была знесена ў 1939 годзе, другую спасцігла не больш зайздросная доля — у будынку знеслі вежу і арганізавалі кінатэатр «Дзіцячы», у гады вайны яна была амаль цалкам разбурана, таму так і не аднавіла сваё існаванне.

### Самае талерантнае медыцынскае таварыства

У любым горадзе XIX — пачатку XX стагоддзя ўрачы складалі найбольш адукаваную праслойку насельніцтва. Таму апроч медыцынскай дапамогі яны неслі яшчэ і асаблівую культуру, якая развівала горад. Напрыклад, цяперашняя бібліятэка імя Пушкіна была заснавана па ініцыятыве Таварыства мінскіх урачоў, і ў апякунскіх саветах бібліятэк імя Пушкіна і імя Талстога менавіта лекары адыгрывалі галоўную ролю.

У Мінску сярод выбітных прадстаўнікоў гэтай прафесіі, як расказаў **даследчык-краязнавец Вадзім ЗЕЛЯНКОЎ,** было нямала немцаў. Адзін з іх — Мікалай Канстанцінавіч Берг. Шмат гадоў ён працаваў у марскім ведамстве, у 1852 годзе выйшаў у адстаўку і быў прызначаны інспектарам медыцынскай управы ў Архангельск. Дарэчы, у той час гэта была галоўная доктарская пасада ў губерні, тое самае, што цяпер галоўны ўрач вобласці.

У 1862 годзе калежскі саветнік, доктар медыцыны, акушэр, кавалер ордэнаў Берг трапляе ў Мінск на той жа пост. Дарэчы, кавалер ордэнаў — гэта званне даволі ўмоўнае, медаль у памяць уціхамірвання польскага мецяжу ўручаўся ўсім чыноўнікам дастатковага высокага рангу. Сярод іх былі не толькі тыя, хто ў ім не ўдзельнічаў, але нават тыя, хто не меў дачынення да ваенный справы.

Адна з галоўных заслуг Берга падчас работы ў Мінску — стварэнне Таварыства мінскіх урачоў. Падобную спробу прадпрымаў і яго папярэднік Кірыл Осіпавіч Спасовіч. Аднак статут арганізацыі так і не быў зацверджаны, яна сама была распушчана, а праз некаторы час Спасовіч звольнены. Пагаворвалі, што прычына была ў яго сыне Уладзіміры, які меў прапольскія погляды, за што яго неўзлюбіў генерал-губернатар Мураўёў. Тым не менш цяжкасці ўзніклі і ў Берга.

А справа была вось у чым. У адрозненне ад суседніх губерняў, мінскае таварыства не дзялілася па нацыянальнай ці рэлігійнай прыкмеце, што ішло ўразрэз з дзяржаўнай палітыкай. Талерантнасць поглядаў захоўвалася доўгі час: і праз 50 гадоў члены Мінскага таварыства ўрачоў пратэставалі супраць таго, каб для заняцця якой-небудзь медыцынскай пасады неабходна было праваслаўнае веравызнанне.



Лютэранская кірха, якая да 1939 года знаходзілася ў цэнтры горада.

Дарэчы, на гэтай глебе ў Берга паўсталі рознагалоссі з кіраўніком Падольскай губерні, дзе ён працаваў пасля Мінска. Пачалася судовая справа, якая доўжылася паўгода, Берга на гэты час нават выклікалі ў Пецярбург. У выніку яго цалкам апраўдалі, але ён вырашыў сам пайсці ў адстаўку. З-за гэтага апошнія восем гадоў свайго жыцця ён правёў на мяжы галечы.

Само таварыства існуе і цяпер. Пасля рэвалюцыі яно было распушчана, затым адноўлена, а з 1926 года падзелена па спецыялізацыях. Тое, што цяпер называецца, скажам, беларускае таварыства стаматолагаў або афтальмолагаў — гэта якраз і ёсць раздробненыя часткі таго самага першага мінскага аб'яднання.

### Шырокая душа і дапытлівы розум

Яшчэ адна гарадская легенда — Вільгельм Данілавіч Гіндэнбург. Аб ім расказвалі, напрыклад, што ён хадзіў на ўсе прыёмы толькі з катом па мянушцы Бургамістр, ці ўжо пазней, што ён у радстве з Паулем фон Гіндэнбургам, які кіраваў Германіяй у 1925—1934 гг. Аднак усё гэта не болей як міф. А вось праўда тое, што ў пачатку кар'еры ён, як паватовы лекар, лячыў кампазітара Міхаіла Глінку, а ў канцы — стаў штатным урачом Пішчалаўскага замка, — расказаў Вадзім Зялянкоў.

Гіндэнбург быў вядомым дабрачынцам. Нярэдка шаўковыя кашулі і дарагая пасцельная бялізна, якую яму дарылі чуллівыя заможныя пацыенткі, аказваліся ў дзяцей беднякоў, кухарак, яўрэйскіх падзёншчыц. Акрамя таго, доктар быў адным з дзейных членаў мінскай лютэранскай абшчыны, актыўна выдаткаваў сродкі на будаўніцтва новай мураванай кірхі.

Нягледзячы на веравызнанне, ён сам прапанаваў арганізаваць бальніцу пры Мінскай духоўнай вучэльні і быў згодны прыняць на сябе лячэнне вучняў бясплатна, калі толькі будуць дадзены медыкаменты.

Душэўныя якасці выдатнага лекара знайшлі адлюстраванне ў літаратуры... У 1877 годзе была апублікавана тая частка дзённікаў Дастаеўскага, у якой распавядалася аб атрыманым ім лісце ад мінчанкі Соф'і Лур'е, а дакладней, ад дзяўчыны Л. з горада М. А гаварылася ў гэтым лісце пра невераґодна добрага доктара Гіндэнбурга. У далейшым Дастаеўскі вывеў яго ў рамане «Браты Карамазавы» пад прозвішчам Герцэнштубэ. Персанаж лагодна частуе хлапчука арэхамі і вучыць парачцы нямецкіх слоў, пры гэтым падымае ўверх палец — гэты жэст, па ўспамінах яго пляменніцы, быў уласцівы і самому Гіндэнбургу.

Дарэчы, на той жа старонцы згадваецца яшчэ адзін знаёмы нам мінчанін, той самы адвакат Уладзімір Спасовіч. Праўда, выведзены ён хутчэй у негатыўным ключы пад крыўдным для таго часу прозвішчам Фецюковіч (сінонім цяперашняга слова «дурань»). Дарэчы, па маці Спасовіч таксама меў нямецкія карані.

А вось сын самога Гіндэнбурга — Вільгельм Вільгельмавіч — у гады вучобы ў Маскоўскім універсітэце быў настаўнікам дзяцей будучага маскоўскага мітрапаліта Інакенція, вядомага сваёй месіянерскай дзейнасцю на Алеуцкіх астравах. Вільгельм так прасякнуўся яго аўтарытэтам, што ў канцы жыцця прыняў праваслаўе — раней была супраць сям'я — і атрымаў імя Васіль. Дарэчы, так нярэдка называлі і яго бацьку, бо імя Вільгельм простым людзям здавалася занадта мудрагелістым. У цэлым сітуацыя з асіміляцыяй немцаў была даволі распаўсюджанай.

Доктар Карл Карлавіч Дзіберг таксама ўвекавечыў сваё імя ў гісторыі. Ён адкрыў эфект, які ўзнікае падчас смерці ад пераахаладжэння, які атрымаў назву прыкмета Госфельда-Дзіберга-Райскага. Згадку пра даследчыка можна было знайсці ў медыцынскіх часопісах 1880-х гадоў па ўсім свеце: ад Вены да Чыкага. Дарэчы, Дзіберг быў яшчэ і старшынёй савета старшын Мінскага музычнага таварыства.

Расказваючы пра беларускіх немцаў, можна назваць яшчэ дзясяткі, а то і сотні імёнаў людзей, якім ёсць за што шчыра сказаць Danke schön.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*



На лаўрышаўскіх могілках.

■ Знаходка

# 12 метраў падмуркаў на старых могілках

**У вёсцы Лаўрышава Навагрудскага раёна знойдзены фундамент манастырскага храма XVI стагоддзя. Яго пашчасціла адшукаць удзельнікам валанцёрскага гісторыка-пошукавага летніка пры Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім мужчынскім манастыры.**

Валанцёры займаліся расчысткай заразнікаў на старых вясковых могілках, якія раней былі манастырскімі, і акурат там адшукалі фундамент. Захаваліся ганак, контур прытвора, асноўнага памяшкання і алтарнай часткі. Цікава, што ўсё выкладзена з валуноў, якія змацаваны паміж сабой вапнавым растворам, — цэгла не выкарыстоўвалася. Капітальны фундамент быў разлічаны на высокую драўляную царкву даўжынёй больш 12 метраў і шырынёй каля 6 метраў.

Царква належала Лаўрышаўскаму мужчынскаму манастыру, які быў заснаваны ў XIII стагоддзі вялікім князем ВКЛ Войшалкам і прападобным ігуменам Елісеем Лаўрышаўскім. Найбольш імаверны час, да якога адносіцца фундамент, — XVI стагоддзе, калі манастыр дасягнуў найвышэйшага росквіту і ў дакументальных крыніцах названы лаўрай.

У праваслаўным летніку пры Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім мужчынскім манастыры на працягу двух тыдняў працавалі студэнты і старшакласнікі, многія з якіх у мінулыя гады ўдзельнічалі ў археалагічных раскопках у Лаўрышаве. Мяркуецца, што ў наступным годзе на расчышчанай пляцоўцы будуць праведзены археалагічныя даследаванні.

Лаўрышаўскі манастыр — адзін з самых старажытных манастыроў Беларусі. Паводле царкоўнага падання, ён быў заснаваны сынам літоўскага князя Трайняты прападобным Елісеем Лаўрышаўскім каля 1225 года ў выгібе на левым беразе ракі Нёман каля падножжа высокай гары.

З часам у ваколіцах старажытнага манастыра Нёман змяніў рэчышча, і манастыр апынуўся на правым беразе ў асяроддзі непраходнай багны.

У XIII стагоддзі манастыр быў цэнтрам летапісання ў Беларусі. Каля 1329 года для Лаўрышаўскага манастыра было створана рукапіснае Евангелле — помнік беларускага кнігапісання, які захоўваецца цяпер у бібліятэцы імя Чартарыйскіх у Кракаве.

Вядома, што ў манастыры былі храмы Уваскрэсення Хрыстова і Нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

## Извещение о проведении 22 августа 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | Установка нанесения упрочняющих покрытий мод. УВНИПА-1-002, год выпуска – 1993 | 4236917 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 3 760,00 | 376,00 |
| 2. | Установка для очистки масла мод. Д4/2, год выпуска – 1996 | 4250198 | | 3 300,00 | 330,00 |
| 3. | станок для балансировки шлифовальных дисков мод. E-ORE, год выпуска – 1960 | 4250200 | | 3 382,02 | 338,00 |
| 4. | Полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239356 | | 11 200,00 | 1 120,00 |
| 5. | Полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239357 | | 11 200,00 | 1 120,00 |
| 6. | Полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239358 | | 11 500,00 | 1 150,00 |
| 7. | Полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239359 | | 11 200,00 | 1 120,00 |
| 8. | Полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239390 | | 11 500,00 | 1 150,00 |
| 9. | Полуавтомат зуборезный мод. 5А270В, год выпуска – 1999 | 4239391 | | 11 200,00 | 1 120,00 |
| 10. | Полуавтомат зуборезный мод. 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220623 | | 12 200,54 | 1 200,00 |
| 11. | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101080 | | 2 650,00 | 265,00 |
| 12. | Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008 | 4101081 | | 2 650,00 | 265,00 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 22 августа 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.08.2017 по 18.08.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017)217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

УНП 190398583

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего УП «Могилевская межрайбаза»**

Лот № 1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-114403 – Встроенное нежилое помещение магазина с подвалом,** площадью 196,5 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ул. Королева, 14, фундамент – ж/бетонные блоки, стены и перегородки – крупно-панельные, перекрытие – ж/бетонное.

**Лифт грузовой с инв. № 41724003**

Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000004000206 (право аренды, доля в праве 7/200), площадью – 0,2963 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания жилого дома, встроенного нежилого помещения с подвалом, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Королева, 14.

***Начальная цена продажи: 428 697,87 белорусских рублей с учетом НДС;***

***Сумма задатка 42 869,79 бел. рублей***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | УП «Могилевская межрайбаза», УНП 700188685, г. Могилев, пр-т Димитрова, 31а |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, номер счета в формате IBAN BY21BPSB30121543370109330000, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 08 сентября 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 07 сентября 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли – продажи. Оплата производится в течение 10 рабочих дней со дня подписания договора купли – продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: - юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; - индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; - физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; - иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ОАО «Агрокомбинат «Олехновичи» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества:

**Лот №1 –** Имущество в составе:

| Недвижимое имущество | | | |
|---|---|---|---|
| № | наименование | инв. № | общ. пл, кв. м |
| 1 | здание конторы (административное здание) | 630/С-60033 | 1557,7 |
| 2 | здание проходной №1 | 630/С-73099 | 56 |
| 3 | здание склада №3 | 630/С-73101 | 16,7 |
| 4 | здание дезбарьера | 630/С-73106 | 51,6 |
| 5 | здание весовой | 630/С-73100 | 133,2 |
| 6 | здание спец. автомобильного транспорта | 630/С-64351 | 736,6 |
| 7 | здание диспетчерской | 630/С-73110 | 22,7 |
| 8 | здание склада | 630/С-73105 | 71,8 |
| 9 | здание проходной №2 | 630/С-73140 | 6,3 |
| 10 | здание склада | 630/С-73103 | 1136,9 |
| 11 | здание склада | 630/С-73102 | 22,3 |
| 12 | мастерские механические | 630/С-64360 | 788,1 |
| 13 | здание колбасного цеха | 630/С-60036 | 902,1 |
| 14 | консервный цех | 630/С-64361 | 257,1 |
| 15 | здание котельной | 630/С-60028 | 890,7 |
| 16 | убойный цех | 630/С-64347 | 2137,9 |
| 17 | здание лаборатории | 630/С-73223 | 286,2 |
| 18 | здание скотобойной площадки | 630/С-73224 | 283 |
| 19 | здание склада для хранения тары | 630/С-73227 | 579 |
| 20 | здание склада | 630/С-73228 | 65 |
| 21 | здание склада | 630/С-73230 | 65,6 |
| 22 | здание склада | 630/С-73231 | 65 |
| 23 | здание склада | 630/С-73435 | 63,9 |
| 24 | здание склада | 630/С-73232 | 64,4 |
| 25 | здание склада | 630/С-73233 | 64,7 |
| 26 | здание ветблока | 630/С-73225 | 503,7 |
| 27 | склад для хранения комбикорма | 630/С-64346 | 865,3 |
| 28 | здание инкубационного цеха | 630/С-73107 | 1002,3 |
| 29 | здание специализированное животноводства | 630/С-64359 | 1363,4 |
| 30 | здание маточника птичника №2 | 630/С-73408 | 1364 |
| 31 | здание маточника птичника №5 | 630/С-73410 | 1386,4 |
